...Камуністычныя суботнікі з'яўляюцца незвычайна каштоўнымі, як фактычны пачатак камунізму...

У. І. ЛЕНІН

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 16 (2647) • Пятніца, 20 красавіка 1973 года. • Цана 8 кап.

М. ШАРЭНКА. Мантажніца.

І. ГЛЕБАЎ. На калгасным таку.

ПРАЦА... СТВАРАЛЬНАЯ ПРАЦА САВЕЦКАГА ЧАЛАВЕКА... ГЭТАЙ ВЕЛІЧНАЙ ТЭМЕ ПРЫСВЯЧАЮЦЬ СВАЕ ЛЕПШЫЯ РАБОТЫ БЕЛАРУСКІЯ ЖЫВАПІСЦЫ, ГРАФІКІ, СКУЛЬПТАРЫ.

І. ДАВІДОВІЧ. Вялікі пачын.

І. СТАСЕВІЧ. Шахцёры Салігорска.

Канстанцыя БУЙЛО

Ленін

Ён прыйшоў, як мары ўвасабленне,
Дыхала надзеямі планета.
Марылі аб шчасці, аб збавенні
Людзі паднявольныя сусвету.
Ён прыйшоў, ён быў зямлі патрэбным,
Як паветра чыстае і воля.
Люд работны ў кашулях зрэбных
Гнуў спіну ад цяжкае нядолі.
Працаваў, збіраў паволі сілы,
І чакаў у думках запаветных...
Час прыйшоў — узняў шырока крылы,
Сцяг свабоды залунаў над светам.
Засвяціла ленінскае слова,
Промні ярка глянулі за краты.
Будавалі мы жыццё нанова,
На зямлі свабоднай і багатай.
Як жа звонка льюцца нашы песні,
Як жа ясна свеціць сонца людзям!
Ленін нарадзіўся ў ранак весні,
Ленін — жыць заўсёды з намі будзе.

УДЗЕЛЬНІЧАЙЦЕ Ў КОНКУРСЕ!

ВЦСПС і Саюз пісьменнікаў СССР праводзяць усесаюзны адкрыты конкурс на лепшы твор мастацкай прозы пра сучасны савецкі рабочы клас. На конкурс прымаюцца раманы, аповесці, мастацка - дакументальныя творы, апублікаваныя ў перыядычным друку або выдадзеныя кнігамі ў 1972 і 1973 гадах, а таксама рукапісы.

Творы, напісаныя на мовах народаў СССР, прадстаўляюцца на конкурс у перакладзе на рускую мову.

Устаноўлены прэміі: першая — 5000 рублёў, дзве другія па 2500 рублёў кожная, тры трэція па 1500 рублёў кожная.

Рукапісы, кнігі і часопісныя публікацыі (у двух экземплярах) прымаюцца да 1 студзеня 1974 года па адрасу: Масква, К-9, Пушкінская вул., дом 1/6, Дом Саюзаў, пакой 32, з паметкай «На літаратурны конкурс». Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены 1 мая 1974 года.

Творы, адзначаныя прэміямі, выпускаюцца выдавецтвамі «Савецкі пісьменнік» і Прафвыдат у першую чаргу і масавымі тыражамі.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую актыўную работу ва ўстановах культуры рэспублікі і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў дырэктара Дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР Шайчука Мікалая Панцеляймонавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У РЭДАКЦЫЮ «ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА»

Прашу дазволу выказаць са старонак газеты «Літаратура і мастацтва» маю шчырую падзяку ўсім, хто па-таварыску павіншаваў мяне з нагоды майго 50-годдзя.

Б. УЛАДАМІРСКІ,
заслужаны артыст БССР.

ДЗЕЯЧЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА, РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ! ВЫСОКА НЯСІЦЕ СЦЯГ ПАРТЫЙНАСЦІ І НАРОДНАСЦІ САВЕЦКАГА МАСТАЦТВА, УДАСКАНАЛЬВАЙЦЕ МАСТАЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ЗДОЛЬНАСЦІ ВЫХАВАННЮ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ!

З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1973 года.

ЧЫРВОНАЯ СУБОТА

На здымку—засядае штаб па правядзенню суботніка Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Злева направа—прарэктар па вучэбнай і навуковай рабоце С. Лакішык, сакратар камітэта камсамола М. Сафронаў, інжынер па рамонту будынка І. Баркун, намеснік сакратара партыйнага бюро І. Усачоў, дэкан мастацкага факультэта В. Валошын, дэкан тэатральнага факультэта А. Першыц.

Заўтрашняя субота — усенароднае свята камуністычнай працы.

Як і ў мінулыя гады, на Ленінскі суботнік выйдзе і творчая інтэлігенцыя нашай рэспублікі. Літаратары і артысты, музыканты і мастакі выступяць у сельскіх клубах, у цэхах, навучальных установах.

— Якімі канкрэтнымі справамі адзначыць 21 красавіка ваш творчы калектыў? — з такім пытаннем звярнуліся карэспандэнты «ЛіМа» да кіраўнікоў некаторых з іх. Вось што яны адказалі:

— Усе нашы артысты, — паведаміў дырэктар Гомельскай абласной філармоніі В. Радзькін, — у гэты дзень будуць выступаць на сцэнах заводскіх і калгасных клубаў, працаваць на прадпрыемствах і ў школах. Канцэртная брыгада «Рускі сувенір» выступіць у адным з калгасаў Мазырскага раёна. Праграму «Ад усяго сэрца» паглядзяць калгаснікі Жлобіншчыны. Перад працаўнікамі Хойніцкага раёна з кінаглядам «Любоў мая, кіно» выступіць Сімон Сімараў. А брыгада, якая абслугоўвае юных гледачоў, пакажа праграму «Буду рабіць добра і не буду дрэнна» ў школах Калінкавіцкага раёна.

Вакальна-інструментальны ансамблі «Сябры» і «Музыкі» ў гэты дзень дадуць канцэрты ў Архангельску і Уладзіміры.

— Шмат работы заўтра ў беларускіх мастакоў, — гаворыць сакратар партыйнай арганізацыі Саюза мастакоў Беларусі Ул. Стальмашонак. — Мы намецілі правесці генеральную веснавую ўборку ў нашым доме. Прывядзём у парадак памяшканні мастацкага фонду, мастацкага салона.

Вялікая работа прадстаіць тым, хто будзе працаваць на нашай новабудоўлі. Заканчваюцца аддзелачныя работы ў выставачным павільёне. У хуткім часе будзем спраўляць наваселле. Прывесці ў парадак памяшканні павільёна і навакольную тэрыторыю — адзін з асноўных пунктаў нашага заўтрашняга плана.

Група мастакоў будзе працаваць на прадпрыемствах Мінска і на вуліцах горада. Яны зробяць замалёўкі з натуры для рэспубліканскіх газет, для тэлебачання, у якіх адлюструюць, як працоўныя сталіцы адзначаць Ленінскі камуністычны суботнік.

— Наш суботнік пачаўся некалькі раней, чым ва ўсіх, — расказвае галоўны рэжысёр тэатра оперы і балета А. Дадзішкіліяні. — Справа ў тым, што 16 красавіка, у свой выхадны, мы паказалі гледачам оперу «Фаўст», сабраныя сродкі перададзім у фонд 9-й пяцігодкі.

Заўтра тры брыгады артыстаў нашага тэатра выступяць перад рабочымі Мінскага аўтамабільнага завода, з якімі ў нас даўнія і моцныя творчыя сувязі.

У вестыбюлі Магілёўскага абласнога тэатра вісіць лозунг: «Усе — на камуністычны суботнік!».

— У нашым калектыве 105 чалавек, — адзначыў дырэктар В. Шмудзянкоў. — Для нас суботнік пачаўся ўжо. Сёння мы прыводзім у парадак тэатральныя памяшканні, наводзім чысціню. А заўтра пакажам прэм'еру па п'есе М. Шатрова «Конь Пржэвальскага». Яе паставіў наш зямляк, лаўрэат прэміі ЛКСМБ У. Бараноўскі.

Усе сродкі, сабраныя ў гэты дзень ад канцэртаў і спектакляў, пойдуць у фонд дзевятай пяцігодкі.

— З раніцы будучыя акцёры, скульптары, канструктары і культасветработнікі збяруцца на кароткі ўрачысты мітынг, — сказаў прарэктар Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута А. Драфа. — Усе мы з'явімся з чырвонымі бантамі на грудзях. Нехта прыйдзе з баянам, нехта з гітарай. На працу пойдзем з песняй. Не дарма ж ужо тыдзень развучваюцца новыя песні аб радасці працы, аб радзіме.

Заўтра большасць студэнтаў будзе працаваць на будоўлі новага памяшкання інстытута. З яго заканчэннем мы атрымаем больш дзвюх тысяч квадратных метраў дадатковай плошчы для аўдыторый, лабараторый, майстэрань. 500 чалавек будуць працаваць на будоўлі і добраўпарадкоўваць дваровую тэрыторыю. Плануем высадзіць там 200 кустоў.

ГОСЦІ МІНСКА

ДРУЖБА ТВОРЧАЯ, АСАБІСТАЯ...

У Мінску адбыліся творчыя вечары буйнейшага савецкага кампазітара, народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР, прафесара Ціхана Мікалаевіча Хрэннікава.

Опера і сімфонія, масавая песня і тэатральная музыка, цудоўныя ўзоры садружнасці з кінематаграфіяй — усё падуладна таленту вядомага ўсяму свету мастака.

Кожная сустрэча з творчасцю Ц. Хрэннікава — гэта спатканне не толькі з кампазітарам, але і з яркім самабытным піяністам. Нездарма імя Ціхана Мікалаевіча залатымі літарамі запісана на мармуровай дошцы гонару Маскоўскай кансерваторыі, якую ён выдатна закончыў па спецыяльнасцях кампазіцыі і сольнага фартэпіяна.

Праграма аўтарскіх выступленняў Ц. Хрэннікава ў Мінску складалася з выканання яго Першай сімфоніі — твора, напісанага яшчэ ў юнацкія гады, які набыў вядомасць ва ўсім свеце і захаваў сваю мастацкую каштоўнасць да нашых дзён, а таксама трох выдатных Канцэртаў: для фартэпіяна, скрыпкі, віяланчэлі. Салістамі ў іх выступалі аўтар і лаўрэаты міжнародных конкурсаў Уладзімір Співакоў (скрыпка) і Міхаіл Хоміцар (віяланчэль). Усю праграму на добрым мастацкім узроўні правёў Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускай ССР пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Юрыя Яфімава.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам першы сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР Ціхан Мікалаевіч Хрэннікаў падзяліўся сваімі ўражаннямі пра сучасную беларускую музыку.

— З мінскімі калегамі мяне звязвае не толькі сяброўства наогул, — яго замацоўвае творчасць, і гэта вельмі каштоўна. Прыемна адзначыць, што Беларусь мае моцны атрад кампазітараў, якія ўнеслі значны ўклад у скарбніцу савецкай шматнацыянальнай музычнай культуры. Вельмі добра, што ў творчасці беларускіх кампазітараў знайшла адлюстраванне шматбаковасць музычных жанраў, што лепшыя з твораў, асабліва песні, набылі вялікую вядомасць у краіне.

Я спадзяюся, што чарговы V Усесаюзны з'езд кампазітараў краіны, які адбудзецца ў пачатку наступнага года ў Маскве, зноў пакажа, што беларуская музыка займае адметнае месца ў савецкай музычнай творчасці.

Я спецыяльна не называю асобныя прозвішчы беларускіх кампазітараў ці назвы іх твораў, бо ўсе аўтары па праву заслугоўваюць цёплых слоў.

Што датычыць беларускіх выканаўцаў, то я лічу неабходным падкрэсліць, што мне зноў было вельмі прыемна сустрэцца з калектывам Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР — цікавым мастацкім ансамблем, — тым больш, што ён за апошнія гады значна пасталеў у сваім выканаўчым майстэрстве. Кіраўнік аркестра— цудоўны музыкант, сапраўды таленавіты, натхнёны мастак.

Мне вядомы многія беларускія выканаўцы, кожны з іх заслугоўвае слова ўдзячнасці за адданасць справе прапаганды савецкай музыкі. Незабыўныя ў мяне ўспаміны пра заўчасна памёршага народнага артыста БССР Ісідара Міхайлавіча Балоціна. Гэта быў адзін з самых таленавітых спевакоў. Ён валодаў цудоўным голасам, слухаць яго было заўсёды асалодай. Ісідару Балоціну я вельмі абавязаны, ён быў першым выканаўцам многіх маіх твораў яшчэ ў час вайны і неаднаразова пасля яе.

Ц. Хрэннікаў на рэпетыцыі.

Днямі ў Маскве адбылося пашыранае пасяджэнне сакратарыята Саюза кампазітараў СССР. Яно прысвечана было ажыццяўленню ўказанняў партыі ў галіне мастацтва, якія выказаў Л. І. Брэжнеў у дакладзе аб 50-годдзі ўтварэння СССР.

На гэтым пасяджэнні сакратарыята вельмі ўдала выступіў паважаны намі кіраўнік беларускай кампазітарскай арганізацыі Рыгор Раманавіч Шырма. У сваёй усхваляванай і шчырай прамове Рыгор Раманавіч правільна падкрэсліў, што перад усімі кампазітарамі краіны стаіць высакародная задача — жыць адным жыццём са сваім народам, што толькі такая блізкасць у спалучэнні з талентам з'яўляецца жыватворнай крыніцай для творчага натхнення.

Яўген КАРШУКОЎ

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

КАВАЛІ

Трэці месяц на Мінскім двойчы ардэнаносным трактарным заводзе дзейнічае пастаянны карэспандэнцкі пост «ЛІМа». Прадстаўнікі рэдакцыі наведваюць цэхі завода, знаёмяцца з перадавікамі працы, вывучаюць вытворчасць. Нарысам Я. Каршукова пачынаем расказ пра людзей аднаго з буйнейшых рабочых калектываў рэспублікі.

УАКНО невялічкага пакоя ярка свяціла сонца. Праз адчыненую фортку дружна ўлівалася сакавіцкае паветра—яшчэ праніліва халаднаватае, але ўжо з тымі ледзьве ўлоўнымі пахамі вясны, якія заўсёды хвалююць, прыносяць радасць чалавеку.

Я сядзеў насупраць Таццяны Васільеўны Кішчанка, слухаў яе мяккі голас, назіраў, як яна стомлена жмурыць свае добрыя вочы і, таропка занатоўваючы сабе ў блакнот прозвішчы, здзіўляўся, наколькі трапна характарызуе яна людзей. Што ж, адчуваецца, мабыць, шматгадовая праца ў калектыве, штодзённыя сустрэчы з рабочымі.

— Карацей, калі спатрэбіцца нейкая дапамога — заходзьце, Абавязкова. А сёння, даруйце, спяшаюся: госці ў нас. Чылійская дэлегацыя на завод прыехала.

Я спахопліваюся: сапраўды злоўжываю часам Таццяны Васільеўны... У яе ж, намесніка сакратара парткома такога буйнейшага ў рэспубліцы прадпрыемства, як Мінскі ордэна Леніна і ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі трактарны завод, кожная гадзіна на ўліку. Ды ўжо так заўсёды: калі цікавы субяседнік, міжволі ахопліваё спакуса прадоўжыць размову: і пра адметныя рысы характару сённяшняга рабочага, і пра той асаблівы псіхалагічны клімат, які ствараецца ў калектыве і забяспечвае яму поспех...

Уважлівыя вочы Таццяны Васільеўны робяцца стражэйшымі, позірк — глыбейшым.

— Бадай, словамі тут усяго не растлумачыш, — пасля паўзы гаворыць яна. — Пазнаёмцеся, як дамовіліся, з брыгадай каваля-штампоўшчыка Івана Тузіна, бліжэй прыгледзьцеся да яго... Мяркую, калі ў наступны раз мы сустрэнемся — размаўляць нам будзе прасцей.

І ўжо зноў, жартаўліва ўсміхаючыся, уручае мне часовы пропуск на завод.

— Вось, залічваем у штат...

Не ведаю чаму, але гэтая невялікая паперка з маім прозвішчам надзвычай хвалюе мяне. Як гонар, як давер усяго славутага калектыву.

І. У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ

Мабыць, яно і добра атрымалася, што ў кавальска-молатавы цэх я трапіў без праважатага — так зручней. Ніхто мяне ні з кім не знаёміў, ніхто не прыспешваў, нікога я не затрымліваў і мог агледзецца. Стаяў, здзіўлены, аглушаны рабочым шумам, грукатам, сапраўднай кананадай — як на перадавой. Пад нагамі нават зямля цяжка ўздрыгвала. І трапяткое зялёнае полымя кароткімі языкамі лізала тугі паўзмрок над печамі, а ўнізе — веерам рассыпаліся чырвоныя іскры акаліны. Жалезныя гмахі парапаветраных штамповачных молатаў узвышаліся ўздоўж сцен, і людзі каля іх не мітусліва, але хутка, са спрытам, прыгожа рабілі сваю справу. Ім, як сапраўдным чараўнікам, усё тут было падуладна.

Шчыра кажучы, адчуваў я сябе не так ужо і ўпэўнена ў кавальскім, бы той пасажыр, які ўпершыню ўзышоў на палубу карабля. Але рабочыя, захопленыя працай (кожная ж хвіліна на ўліку), не звярталі ўвагі на зайшлага чалавека, і я крочыў па цэху, спыняўся, зачараваны незвычайнай суладнасцю людзей, узіраўся ў іх азораныя ружовым полымем, засяроджаныя твары. І, мажліва, калі б я нават зусім не ведаў у твар Івана Тузіна, калі б я не бачыў яго партрэта на заводскім дварэ сярод перадавікоў вытворчасці, на плакаце «Лепшы каваль-штампоўшчык горада», я ўсё роўна натрапіў бы на ягоную брыгаду... Адчуў бы, як кажуць, дзе яна ў гэтым «баявым» цэху, вызначыў бы па незвычайна рытмічнай, зладжанай працы, дзе ашчадныя і надзейныя рухі рабочых выверены і шматгадовым вопытам і шчырым імкненнем аддаць усяго сябе справе...

Міжволі прыгадаўся мне верш аднаго паэта, юнацтва якога пачыналася ля гэткага ж молата на «Гомсельмашы» і які здолеў пранікнуць у паэзію працы кавалёў-штампоўшчыкаў, натхніўся ёю на многія гады:

Стреляя паром,
буен,
По огненному диску
Бил молот, будто в бубен,
А я смотрел на искры.

Они взлетали роем,
Сияли ореолом,
Как будто над героем,
Над кузнецом весёлым.

Удар великолепен —
Кузнец легко и броско
Деталь из стали лепит,
Как будто бы из воска.

Я паўтараў гэтыя радкі і прагна назіраў, як знатны каваль-штампоўшчык Іван Тузін і яго руплівыя сябры «тварылі казку» з металу... І хай я не быў яшчэ знаёмы з кожным асабіста, але ўжо адчуваў глыбокую павагу і сімпатыю да іх. Я амаль быў перакананы, што тут, сярод гэтых клапатлівых рабочых, поспех вырашаўся не толькі звычайнай суладнасцю ў працы, неабходным высокім узаемаразуменнем, але і роднасцю душ... Здавалася: недзе ў груку, гуле цэха нараджаліся і ўрачыста плылі крыштальна-чыстыя гукі жыццярадаснай, знаёмай мелодыі пра подзвіг рабочага чалавека: «Мы кузнецы, и дух наш молод...».

Узрушаны, стаяў я і пазіраў на невысокага, рухавага Тузіна — як ён звыкла перакідвае гарачую шматкілаграмовую нарыхтоўку, раз-пораз націскае на педаль і як сталь пакорліва плюшчыцца і іскрыцца пад магутным ударам молата, набывае неабходную форму, як потым спрытна захопліваё ўчэпістымі абцугамі адштампаваную пакоўку размеркавальнага вала зграбная Алена Курылюк і ўкладвае на абразны штамп...

І цяжка было адарвацца, зачараванаму, ад хлопцаў, статныя, мускулістыя постаці якіх так і дыхалі здароўем, упэўненасцю, зайздросным адчуваннем маладой хмельнай сілы... Знаёмы завочна з усёй брыгадай, я лёгка вызначыў: вунь той, рослы, цыбаты, што смела кідае спрактыкаваныя пільныя позіркі ў пашчу печы і хутка дастае адтуль распаленыя сталёвыя круглякі — наравальшчык Іван Аляшкевіч; той, з учэпістымі губастымі абцугамі, каля абразнога станка — вальцоўшчык Саша Пашкевіч...

Да канца змены было яшчэ даволі многа часу. Па-ранейшаму цяжка вохкалі молаты і дрыжала цёплае пругкае паветра. Высокі тэмп працы не запавольваўся ні на хвіліну. Не да перакуру, не да прахалоды ля вентылятара... Я нават не падумаў замінаць людзям сваімі, недарэчнымі тут, пытаннямі... Час у кавалёў вельмі дарагі. Ён вырашае і колькасць, і якасць паковак. Ледзьве зазяваўся, заюшыўся—перагрэецца метал у печы, пакрыецца акалінай...

Мушу ісці.

Міма прабягае ў касцы, як у тых пажарнікаў, хлапчанё, прыпыняецца, гарэзліва крычыць у вуха: «Карэспандэнт? А фотаапарат дзе?». Бліснула белазубая ўсмешка на замурзаным твары — вясёлая, радасная. І можа ўпершыню я пашкадаваў па-сапраўднаму, што не фатограф і што няма ў мяне пры сабе фотаапарата.

ІІ. 26 САКАВІКА

Ад прахадной да кавальскага метраў дзвесце... І за гэтыя мінуты, што крочыш да цэха, з цікавасцю назіраеш, як пульсуе навокал жыццё калектыву. Ідуць рабочыя. Міма зухавата праносіцца на трактары малады рабочы — тут і жаданне хутчэй даставіць у цэх дэталі, і радасная ўзрушанасць ад таго, што, мажліва, упершыню даверылі машыну. А то бачыш задумлівага пажылога рабочага, які паважна кіруецца да прахадной. І раптам, узняўшы ўверх вочы, зусім па-сялянску мудра зірне ў блакітнае неба. Аб чым ён думае, якія чалавечыя клопаты трывожаць яго — невядома. Але, калі стары кідае позірк на хлопца з дзяўчынай (ён — з працы, яна — на працу), што ўтрапёна, моўчкі стаяць паблізу, ніяк не адарвуцца адзін ад аднаго, тонкая і па-бацькоўску зычлівая ўсмешка кранае яго вусны: каму ж невядома гэтае непаўторнае пачуццё...

А рабочыя ідуць і ідуць... І ў гэтым людскім руху столькі жыцця, урачыстасці, нейкага асаблівага важнага сэнсу, што міжволі ловіш сябе на думцы: зайздросціш... Зайздросціш дружнаму калектыву трактаразаводцаў, яго невычэрпнай энергіі, маладосці.

Каля самага адміністрацыйнага корпуса мяне чакае прыемны сюрпрыз: на дошцы аб'яў — паведамленне... «26 сакавіка брыгада штампоўшчыкаў цэха КМЦ у складзе Тузіна І., Курылюк А., Пашкевіча А., Аляшкевіча І. адштампавала 936 штук дэталей пры заданні 580 штук, выканаўшы зменнае заданне на 161 працэнт. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва брыгада Тузіна заваявала першае месца...». Ну і малайцы, тузінцы! З усмешкай прыгадваю, што «тузін» азначае дванаццаць... А іх у брыгадзе — усяго чатыры чалавекі. Але якія! Усіх дванаццаці вартыя.

Вось яны, вынікі аднаго дня брыгады, вось ён подзвіг... Працоўны подзвіг, які складваецца, на першы погляд, з учынкаў, падзей самых звычайных, звыклых. Здавалася б, што асаблівага — перавыканалі заданне... Але за гэтай падзеяй стаіць нешта большае, чым вытворчыя паказчыкі. Самаадданасць. Высокае разуменне свайго рабочага абавязку... І яна, гэтая падзея, характарызуе не толькі Тузіна-каваля, але і Тузіна — камуніста, арганізатара.

Якраз напярэдадні адбылося пасяджэнне парткома кавальскага корпуса. Пасяджэнне важнае, з надзвычай надзённым пытаннем: аб стане і мерах па далейшаму росту прадукцыйнасці працы ў кавальска-молатавым цэху і цэху гарызантальна-ковачных машын. Неабходна падсумаваць дасягненні і пагутарыць — прынцыпова, сур'ёзна — аб тым, што перашкаджае працаваць яшчэ лепш у трэцім годзе дзевятай пяцігодкі. Запрасілі на пасяджэнне і брыгадзіраў.

І паказальна, што адным з першых выступіў у спрэчках камуніст Іван Тузін. Заклапочаны, незвычайна сур'ёзны, спыняючы свой спакойны позірк то на адным, то на другім членах парткома, ён гаварыў нетаропка, але важка, намагаючыся, каб усе зразумелі яго думкі. Таварышы слухалі Тузіна ўважліва, з тым бязмежным даверам, які ўзнікае да чалавека не ад мімалётнай сімпатыі, а выпрацоўваецца гадамі... Так, гэта правільна, казаў Тузін, дасягненні ёсць. Шырока разгарнулася паміж брыгадамі корпуса сацыялістычнае спаборніцтва. Пяцігодка — у сэрцы кожнага... Але калі хочам, каб паказчыкі былі яшчэ больш адчувальнымі, павінны гаварыць аб тым, што тармозіць працу. Самае хворае месца — перабоі з дастаўкай нарыхтовак. З гэтай прычыны прастоі ў кавалёў. Прастоі ў такі напружаны, гарачы час, калі кожны поўны энтузіязму працаваць хутчэй? Хіба ж даравальна? Хіба можна з гэтым мірыцца?

Расхваляваўся непрыкметна для сябе, сказаў нават больш, чым меркаваў. Але ж нельга тут быць абыякавым. Счакаўшы, закончыў зусім проста, з крыху збянтэжанай усмешкай, ды цвёрда:

— Што тычыцца нашай брыгады — падумаем, як працаваць яшчэ лепш. Адным словам, як і абяцалі — пяцігодку ў чатыры гады...

Ці варта казаць, што прынцыповая гаворка аб своечасовай дастаўцы нарыхтовак, аб унутраных рэзервах адразу ж знайшла водгук у брыгадзіраў. Падтрымалі члены парткома. І ў пастанову запісалі: прыняць тэрміновыя меры па бесперабойнаму забеспячэнню цэхаў нарыхтоўкамі, павысіць прадукцыйнасць працы.

Ну, а як жа ўспрынялі размову на парткоме тузінцы? Выступленне свайго брыгадзіра адобрылі. А словы са справай у іх не разыходзяцца: 26 сакавіка і было адным з такіх дзён, які падмацаваў абяцанне камуніста Івана Рыгоравіча Тузіна даваць у змену яшчэ больш паковак.

(Заканчэнне ў наступным нумары)

СЯМ'Я

Іван ШАМЯКІН

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

Цесная сувязь з жыццём — адна з характэрных рыс творчасці Івана Шамякіна. У яго раманах, аповесцях, апавяданнях знайшла сваё адлюстраванне наша сучаснасць, савецкая рэчаіснасць.

Цяпер пісьменнік працуе над новым раманам — яго героямі будуць архітэктары, горадабудаўнікі.

Прапануем чытачам фрагмент рамана Івана Шамякіна.

ПОЛЯ радавалася, калі за сталом збіралася ўся сям'я. У апошнія гады гэта рэдка здаралася. Нават снедалі паасобку, бо ў розны час ішлі ў школу, у інстытут, на працу. Абедалі разам хіба толькі ў выхадныя і святочныя дні, але таксама не заўсёды — парадак парушаў Ігар. На вячэру ён таксама рэдка з'яўляўся. І нельга яго было папракнуць: дваццаць шосты год хлопцу, самастойны чалавек, малады архітэктар, у яго свае інтарэсы, свае сябры, дзяўчына...

У той вечар матчына радасць ад Верынай весялосці папоўнілася яшчэ гэтай, няхай невялікай, радасцю: да вячэры сабраліся ўсе. З гэтае нагоды Поля накрыла стол у «зале», вячэру згатавала амаль святочную, нават пляшку самаробнага віна паставіла — для мужчын. Малых захапляла такое застолле, асабліва Кацьку, якая садзілася на ганаровае месца — у тарцы стала, побач з бацькам.

Раней Вера часта кпіла з зацяглага братавага кахання да маладой дактарыцы; дзяўчыны прыгожай, але капрызнай (гэтая якасць сынавай нявесты засмучала маці). Апошнія месяц-паўтара Вера ўсяляк пазбягала размовы на гэтую тэму, што, між іншым, было для маці яшчэ адным трывожным сігналам.

За сталом Вера гарэзліва спытала, яшчэ раз за гэты дзень пацешыўшы маці:

— Гарык, нешта медычку тваю я даўно не бачыла. Ці не пасварыліся вы?

Ігар даў сястры лёгкую пстрычку па носе, насмяшыўшы малых.

— Па-першае, я табе, кнопка, не Гарык, а Ігар Віктаравіч. Архітэктар з дыпломам. Засячы на сваім кірпатым носе. А па-другое, калі бацькі лічаць, што табе не рана ведаць пра такія рэчы, то ведай: такі сабачы холад астуджвае ўсе пачуцці.

— Раней было наадварот, — пасміхнулася маці, раскладваючы на талеркі духмяныя і румяныя, падсмажаныя з цыбуляй скваркі.

— Калі гэта было наадварот, мама? — засмяяўся Ігар. — І што было наадварот?

— Зімой збіраліся на вячоркі...

— Хэ, успомніла дагістарычны перыяд! А дзе нам сабрацца? Чым больш мы будуем, тым цясней нам жыць. Парадокс. Праўда, бацька?

Віктар не адгукнуўся. Яму не хацелася ўсчынаць бясплённую спрэчку з сынам. Хапала такіх спрэчак раней. А Ігару сёння карцела паразважаць. Ён цыкнуў на Кацьку, той раптам уздумалася памяняцца з Таняй відэльцамі, але школьніца трымалася педагагічнага прынцыпу: не ўступаць пястунцы, усе, маўляў, уступаюць ёй, і яна хутка сядзе на галаву.

— Кацярына вялікая! Не шумі. Слухай мудрыя прамовы. А то пасаджу пад стол.

— Ты — Ігар Віктаравіч! — імя малая вымавіла, як мянушку, абразу. — Сам палезеш пад стол.

— Спрабавалі мы, мама, наладзіць вячоркі. Але, па-першае, больш двух-трох пар ніводная сям'я не вытрымлівае. Музыку нашы высокаінтэлектуальныя каханыя заводзяць такую, што нават у мяне, загартаванага, пачынае балець жывот. І адразу ж з усіх бакоў, зверху і знізу, гучыць акампанемент. У выглядзе пагрозлівага стуку. Так мы з табой, бацька, будуем.

— Не мы будуем, — запярэчыла Вера.

— Любая мая! На трэцім курсе пара ўжо ведаць ролю архітэктара ў будаўніцтве. Хоць я амаль згодны з табой, сястра. Не мы будуем, — і глянуў на бацьку, яўна жадаючы ўцягнуць яго ў спрэчку, бо ведаў, што з такім сцвярджэннем стары Шугачоў не можа пагадзіцца. Але Віктар зноў змаўчаў. І сын прадоўжыў свае разважанні наконт таго, дзе і як праводзіць час моладзь.

— Было адно прыстойнае месца — кафэ «Космас». Там можна было сагрэць нутро і разагрэць цела танцамі. Але цяпер і там забаранілі нават сухое віно. Ваюем з п'янствам! Што ж засталося рабіць? Піць цэлы вечар дрэнную каву? Нэ можам. Нэ прывучаны да такога далікатнага пітва.

Кацька засмяялася з яго «нэ».

— Ты часта пачаў саграваць нутро, — незадаволена кінуў Віктар.

— Бацька! Недакладную маеш інфармацыю, а таму няправільны робіш вывад. За мой заробак не вельмі разгонешся, каб і хацеў. Палавіну я аддаю маці.

Поля сказала:

— Жаніўся б ты, Гарык.

— На кім? На Жане? Куды ж нам дзецца? Дзе пасяліцца?

— Знайшлося б месца. У цеснаце...

— О, не, мама! Ведаючы Жану, ніколі не прывяду яе сюды. Шкадую цябе. Сапсуе яна табе жыццё.

— Навошта ж кахаць такую цацу? — па-даросламу сурова, асуджаючы брата, спытала чатырохкласніца Таня.

Поля сумна ўсміхнулася — ёй даўно не падабалася залішняя, сапраўды недзіцячая, рацыянальнасць малой.

Ігар весела ўхваліў сястру:

— Ты мудрэц, Танюля! Філосаф! Але, найдаражэйшая мая сястра, у жыцці не ўсё так проста, як табе здаецца. І Жана не толькі цаца ў тваім разуменні. Жана — загадкавае стварэнне не менш загадкавай прыроды. А ўсё загадкавае нас прыцягвае. Як магніт цвічкі. Бачыла?

Віктару не спадабалася, што такая размова вядзецца пры малых. Нават Кацька, і тая «навастрыла вушы». Даволі таго, што тэлевізар адкрывае дзецям больш таямніц, чым ім варта ведаць у іх узросце. Ды і Вера, спачатку вясёлая, пад час размовы аб братавай жаніцьбе насцярожылася і як бы замкнулася: не падтрымлівала ні маці, ні Ігара. Вера, магчыма, лепш, чым хто, ведае гэтую Жану, і для яе было б амаль трагедыяй з'яўленне ў кватэры нявесткі ды яшчэ такой нотнай, як вызначыў Жану Максім, калі Ігар пазнаёміў іх. Максім, між іншым, сказаў тады Віктару: «Не жадай жаніцьбы сына на гэтай красуні. Гэта — копія маёй Дашы».

Дзіўна, што Поля не падумала пра Веру, раючы сыну жаніцца.

Каб перавесці размову на іншую тэму, Віктар сказаў сыну:

— Быў у вашай майстэрні. Глядзеў праекты забудовы Маскоўскай. Што вы робіце? Ніводнага арыгінальнага рашэння. Усё тыповае ў найгоршым значэнні гэтага слова.

— Бацька! Асцярожна! Тыповае стала палітычным словам. Жывем у век стандартызацыі. А яшчэ вялікі Карбюзье сказаў: архітэктура аперыруе стандартамі.

— Ты нахапаўся цытат, а да сэнсу іх не даходзіш. Архітэктура аперыруе стандартнымі матэрыяламі, гэтага патрабавала індустрыяльнае будаўніцтва, але сама архітэктура не можа... яна ніколі не павінна быць стандартнай.

— Гэта тваё пажаданне, бацька. Яна даўно ўжо стала такой, твая дарагая архітэктура. Скажу парадокс: тыповае будаўніцтва зменшыла патрэбу грамадства ў архітэктарах... Яны не патрэбны.

— Ну, загнуў! — засмяялася Вера. — Нас усюды не хапае.

— Каго не хапае ? — здзівіўся Ігар. — Я кажу пра архітэктараў-мастакоў, якім уяўляе сябе наш бацька...

— Ігар! — маці даўно не падабалася сынава іронія ў адносінах да бацькі. Але Віктар паблажліва ўсміхнуўся ёй: маўляў, няхай гародзіць, я не крыўдую.

Ігар наступаў на сястру:

— Ты заглядваеш у спецыяльныя часопісы?

— Я чытаю іх больш за цябе.

— Чытаеш, але не думаеш. Чула пра ЦНДІЭП?

— У нашым доме пра яго Кацька ведае.

— Дзякуй богу. Я ў ім быў. Гэта грандыёзная ўстанова. Там усё на ўзроўні сённяшняй праектнай тэхнікі. ЭВМ, ЭСУ і гэтак далей. Інакш нельга. Адстанем. Па праектах гэтага інстытута будуюцца амаль усе тэатры, кінатэатры, клубы, адміністрацыйныя будынкі, спартыўныя комплексы. Усё, што фарміруе эстэтычны воблік гарадоў. У дзесятках, калі не ў сотнях гарадоў Саюза ўжо збудаваны ці будуюцца тэатры, палацы, дамы Саветаў па праектах адных і тых жа архітэктараў, якія працуюць у гэтым інстытуце. Навошта ж пры такой сістэме дзесяць... дваццаць тысяч дойлідаў? Іх даволі сотні.

— Вы з Макаедам самы геніяльны праект «пасадзіце» так, што вырасце канюшня, — як бы між іншым сказаў Шугачоў-старэйшы, усё яшчэ не жадаючы залазіць у гушчар спрэчкі, бо не аднойчы вылазіў з яго са стрэмкай у душы.

— Бацька, не пераходзь на асобы! Недазволены прыём! Але я лаўлю цябе на слове. Ты згадзіўся... амаль згадзіўся, што дойлід у класічным разуменні ў наш час не галоўная фігура. Ва ўсялякім разе, у такім горадзе, як наш. Архітэктар-планіроўшчык, архітэктар-арганізатар... Во каго не хапае, дарагая сястра! Іх патрэбна армія пры нашых маштабах. Планіроўшчыка просяць у кожным калгасе. А праекты дамоў ім прышлюць, якія яны захочуць. Маскоўскія. Мінскія. Чэшскія. Польскія. Індустрыялізацыя будаўніцтва вядзе да інтэрнацыяналізацыі архітэктуры. Нацыянальная архітэктура — у мінулым. У помніках.

— Гэта ж няпраўда! — горача запярэчыла Вера. — Няўжо ты не бачыш розніцы ў праектах нашых і армянскіх архітэктараў? Літоўскіх і ўзбекскіх?

— Гэта апошнія патугі. Правінцыялізм. Цэнтралізацыя праектавання скончыць з гэтым анархізмам, які вы, традыцыяналісты, узнімаеце, як сцяг.

— Сын мой,—з урачыстай іроніяй, але з затоеным глыбокім смуткам, бо адчуваў у Ігаравых словах долю праўды, сказаў Шугачоў-старэйшы,—мы з табой пра-вінцыяльныя архітэктары. Што ж застанецца на нашу долю?

— Я сказаў што: планіроўка і арганізацыя. Гэта, між іншым, даўно зразумеў твой сябра Карнач...

— Зноў няпраўда! — амаль радасна і пераможна выгукнула Вера.—Па праектах дзядзькі Максіма ўзведзены самыя цікавыя будынкі. Найлепшы палац культуры...

— Ну, не ўсе яго лічаць найлепшым. Многія нашы калегі ўжо ганьбуюць гэты палац.

— А ты як лічыш?—спытаў бацька з настойлівай суровасцю.

— Я?—Ігар на момант сумеўся.

— Ён аплёўвае,—сказала Вера з крыўдай і горыччу за тое, што член іх сям'і, брат яе, так непаважліва ставіцца да свайго настаўніка. У тым, што Ігар і яна пайшлі ў архітэктуру, заслуга дзядзькі Максіма, магчыма, большая, чым нават бацькі, бо не хто іншы, а ён вучыў іх, малых, маляваць і будаваць палацы з мокрага пяску, з гліны, з кубікаў.

— Я пакуль што прыглядаюся.

— Прыглядаешся? Да каго? Ці прыслухоўваешся да Макаеда?

— І прыслухоўваюся. Каб ведаць ісціну...

— Ты менш бы разносіў макаедаўскія плёткі! Гэта занятак бездарнасцяў.

Адчуўшы, што бацька пачынае злаваць, Ігар паспрабаваў павярнуць размову на жарт.

— Мама!—як малы, крыкнуў ён маці, якая ўвайшла ў пакой з талеркай апетытных блінчыкаў з творагам, густа палітых расплаўленым маслам.—Мне хочуць заткнуць рот!

Дысцыплінаваная Таня і Толя, які лічыў сябе зусім дарослым, заўсёды з цікавасцю слухалі спрэчкі архітэктараў. Маці, найвышэйшы аўтарытэт, у любых бытавых справах і размовах, ніколі не ўмешвалася ў прафесійныя спрэчкі мужа і дзяцей, хіба толькі, калі ўжо занадта пачуцці распаляліся, і брат і сястра пачыналі абражаць адзін аднаго ці калі Ігар дазваляў сабе непаважліва кпіць з бацькі. Поля радавала, што яны збіраюцца разам і так спрачаюцца.

Сумавала адна малая Кацька, але ведала, што калі ўсе заняты сур'ёзнай размовай, яе ніхто не падтрымае, усе будуць супраць, і нішто не паможа—ні стук лыжкай па талерцы, ні лямант, ні слёзы; скончыцца тым, што яе выставяць з-за стала. І яна сваволіла ўпотай. Ігару непрыкметна наліла ў віно гурочнага расолу. Толіку хацела высыпаць на бульбу жменю солі, але той злавіў яе руку і высыпаў соль у яе талерку. Каця паспрабавала замяніць талеркі — забраць сабе Таніну, але старэйшая сястра таксама была пільная. Тады Кацька стукнула пад сталом яе пагой. Таня ў адказ балюча ўшчыкнула задзіру за бок. Кацька не заплакала, але тут жа прыдумала помсту: яна выцягне тайком з Таніна-га партфеля сшытак па матэматыцы, няхай Таня заўтра атрымае двойку.

Ігаравы словы, што яму хочуць заткнуць рот, рассмяшылі малую. Кацька ўявіла, як і чым гэта можна зрабіць—заткнуць рот, і ажно зайшлася ад смеху.

— Мама! Ігару заткнулі рот.

— Чым? — усміхнулася Поля, ставячы талерку з блінчыкамі на сярэдзіну стала.

— Ігар! Чым табе заткнулі рот?

— Словамі, дарагая Кацярына.

— Хіба словамі можна заткнуць?—сур'ёзна здзівілася Кацька. Дзіцячая непасрэднасць і літаральнае разуменне сэнсу слоў усіх рассмяшыла.

— Можна, Кацька. Такое заткала ўставяць, што не пікнеш.

— Не вярзі лухту дзіцяці,—сказала маці.—Хто табе ставіў заткалы?

— Ніхто, здаецца. А між тым,

АРХІТЭКТАРАЎ

чамусьці я зрабіўся мудрым. Часам хочацца на парадах, на сходах сказаць тое, што думаю. Але ўключаецца нейкі аўтаматычны тормаз. Часам тармозіць мёртва: а ці не лепш памаўчаць? А часам спускаюся ціха, роўна, як добры шафёр з гары, кажу тое, што падабаецца начальству...

— Начальству? — з пагардай спытала Вера.

— Не, сястра. Кажу тое, што падабаецца большасці. Іграю, як пасрэдны акцёр, на публіку.

— Навошта? — сур'ёзна, нават устрывожана, спытала Поля.

— Чорт яго ведае. Карысці ад гэтага ў большасці выпадкаў я не маю ніякай.

— Ён, як Кацька,—сказала Вера. — Хоць глупства сказаць — абы звярнуць на сябе ўвагу.

— Ты сама глупая! — закрычала абражаная Кацька.

Вера адмахнулася ад малой.

— А хутчэй — гэта ад Жаны. Яна любіць паказаць сябе. З кім павядзешся...

— ...ад таго і блох набярэшся,— памог сястры Толя, без усмешкі і, здаецца, без асаблівай цікавасці да іх размовы. Ён прыкінуў, ці хопіць яшчэ на ўсіх па адным блінцы, малодшы сын быў самы справядлівы і самы несправядлівы ў сям'і: заўсёды дзеліць на ўсіх, любую зрабізу, і абыякавы да розных умоўнасцей, якія, на яго думку, ускладняюць чалавеку жыццё: напрыклад, відэльцам ён браў толькі тую страву, якую нельга ўзяць пальцамі, а блінец не кавыраць відэльцам, а ўзяць пецярнёй — любата.

Маці чуе кожнае слова, бачыць кожны жэст і позірк.

— Бяры, бяры, Толя, не лічы. На кухні яшчэ ёсць. Таня! Ты аднаго блінца не можаш адужаць?

— Мамачка! Так вячэралі купцы.

— Граматныя вы ўсе!

Варта было адказаць Ігару, які, пакуль яна прапаноўвала малодшаму сыну блінец, гаварыў Веры:

— А я думаю гэта — ад бацькі. Спадчыннасць. Нарэшце яе не адмаўляюць у нас.

Распусціўся ўсё-такі Ігар — ніякай павагі да бацькі.

Але Віктар не пакрыўдзіўся на сынавы словы, з вялёлай усмешкай адказаў:

— Не, маніш, брат. На сходах я выступаў раней рэдка. На публіку ніколі не іграў. Гэта хвароба твайго пакалення. Нам было не да гэтага.

— Бацька, не перанось маю хваробу на ўсё пакаленне. Сам ты сказаў: мы — розныя. І вы розныя. Карнач і ты, напрыклад. Хоць вы і сябры.

— У нас розныя характары. Але ў нас адны ідэалы.

— Толькі ты змагаешся за іх як ідэаліст, а Карнач — як рэаліст. Ён будуе палацы... Іх могуць лаяць. Але пра іх будуць пісаць манаграфіі. Цяпер ён захапіў сабе манумент партызанам...

Ігар асекся. Ён раптам убачыў, як бацька паклаў відэлец — занадта асцярожна, і якім пунсовым зрабіўся яго твар, поўны, але звычайна бледны.

Нават Кацька, здаецца, адчула навальніцу — прыціхла.

Толькі Поля, аслабіўшы ўвагу, калі ўбачыла, што да сынавых непаважлівых намёкаў Віктар паставіўся з мудрай лагоднасцю, не адразу сцяміла, што ж раптам угнявіла яго — якія Ігаравы словы. Закід Максіму, што той узяў сабе архітэктурны праект манумента славы? Але хто ў нас можа зрабіць лепш за яго?

— Сын мой, — небяспечна ціха і хрыпла звярнуўся Віктар да сына. — Я разумею так: ты хочаш сказаць, што я непрактычны дурань, што ўсё жыццё праектую жыллё. Так?

Ігар не адказаў.

Шугачоў-старэйшы падняўся з-за стала, і голас яго зазвінеў:

— Але. Я праектую жыллё. І скажу табе, што ні адзін палац, ні адзін манументальны комплекс мне не даў бы той радасці, якую дае праца над жылым домам, раёнам...

— Гучныя словы, бацька. Хто пра іх сказаў добрае слова, пра твае дамы?

— Ігар! — абурылася маці.

— Нічога, Поля. Гэта добра, што сын так раскрываецца, хоць і сумна, што так. Любоў да славы рухае творчасць, але часта і губіць мастака... Я таксама думаў пра яе — пра славу. Раней — больш, цяпер — менш. Але, калі можаш, прашу паверыць... Гэта не гучныя словы. Працаваў я не дзеля яе, не дзеля манаграфій. Праектуючы, я думаў пра людзей... пра дзяцей... пра цябе, пра Таню, каб ім было цёпла, утульна... прасторна...

Ігар хмыкнуў.

— Я разумею цябе. Думаеш, у мяне не балела душа, калі я праектаваў лесвічныя клеткі, праз якія нельга было занесці мэблю і вынесці труну, сумешчаныя санвузлы і два з палавінай метры ад падлогі да столі? Але што лепш — такая кватэра ці нічога? Цяпер мы пабагацелі. Перараслі гэтыя габарыты. Шмат ад чаго адмовіліся. Цяпер мы можам думаць пра горад, раён, які задаволіў бы патрэбы людзей заўтрашняга дня... твае патрэбы... Кацькіны... Нават патрэбы тваёй Жаны, — Шугачоў усміхнуўся, абышоў стол, спыніўся перад сынам і дачкой і ўрачыста абвясціў: — І я зраблю такі раён! Ён ужо збудаваны! Тут! — ён пляснуў далоняй па ілбе, павярнуўся і сказаў да жонкі цішэй і як бы з меншай упэўненасцю: — Я зраблю такі раён у Зарэччы. Не гледзячы ні на што, — і сеў на сваё месца, усміхнуўся, спачатку знясілена, быццам толькі закончыў непасільную працу, пасля — вінавата, як бы просячы прабачэння, што не ўсё зроблена так, як ім, дзецям, хочацца, паспрабаваў пажартаваць: — Ты яшчэ напішаш манаграфію пра мой раён.

— Брава, тата! — шчыра і радасна ўхваліла Вера.

— Брава! — запляскала ў далоні Кацька. У свае пяць гадоў яна не ведала, што азначае «заткнуць рот», але добра разумела мову архітэктараў і ведала, з чаго пачынаецца будаўніцтва дома і горада —з праектаў, якія рысуюць бацька і Ігар.

У Поліных вачах з'явілася трывога, яна адна адчула, што ў Віктара неспакойна на сэрцы. Упершыню яе не ўзрадавала, што ён гаворыць з дзецьмі так сур'ёзна, такімі высокімі словамі і хваліць сябе. Значна прасцей было яго зразумець, калі ён пасміхаўся з Ігаравых тэорый ці абураўся, крычаў. У такіх выпадках яна з усмешкай думала: «Няхай хоць у сям'і чалавек праявіць сваю ўладу».

Ігар глядзеў на бацьку без звычайнай іранічнай усмешкі, сур'ёзна і пранікнёна, быццам убачыў раптам зусім іншага чалавека.

— А ты ведаеш, стары? Твая такая ўпэўненасць спадабалася мне. У цябе ніколі не хапала ўпэўненасці. Кожны свой праект ты ставіў пад сумненне. Толькі ўсё карначоўскае хваліў.

— Карнача не чапай. Ён выдатны архітэктар.

— Ён цябе вырасціў, парасёнак ты, — з крыўдай за Максіма кінула брату Вера.

Поля мыла талеркі, калі Віктар увайшоў на кухню. Спыніўся ў яе за спіной. Па кроках, па маўчанню нават, магчыма, па дыханню, яна адчула, што ён хоча пагутарыць адзін на адзін.

— Зноў мыеш сама? — незадаволенасць яўна знарокавая. — Мала ў цябе памочнікаў? Талеркі не могуць памыць!

— Віця! У кожнага з іх свае заданні. Такія ўрокі!

— Росціш беларучак.

— Віця, у нас нядрэнныя дзеці, — Поля старалася гаварыць мякка, асцярожна, каб не зачапіць тое, што ў яго баліць, яна ніяк не магла здагадацца, што ж гэта такое, а таму трывожылася.

Віктар адышоў і сеў на табурэтку каля стала. Памаўчаў.

— Поля!

— Што, Віця?

— Я сказаў ім няпраўду. Дзецям.

Яна паставіла талеркі на тумбачку і павярнулася ад ракавіны, зняла з пляча ручнік і захутала ім пачырванелыя ад гарачай вады рукі, быццам засаромелася, што яны такія, рукі — чырвоныя і брудна-масляныя.

— Самае дзіўнае, што іменна сёння я хацеў сказаць вам праўду. Але гэты чортаў сын, Ігар, так павёў размову, што я не мог інакш. Зразумей...

— Не, не разумею, — чуць паварушыла жанчына вуснамі.

Шугачоў на міг закрыў твар далонямі, але тут жа працёр пальцамі вочы, нібы туды трапіў пыл, сцёр гэты пыл са шчок і сказаў рашуча:

— Зарэчнага раёна не будзе. Не, раён будзе, але не па маім праекце.

Пачакаў, што яна адкажа. Поля маўчала. Ён падхапіўся і, ходзячы па цеснай кухні — тры крокі туды, тры назад, пачаў горача і мнагаслоўна пераконваць:

— Думаеш, мне лёгка слухаць тыя папрокі, якія я чую ад роднага сына? Ты думаеш, я — дурань, не разумею, што ён кажа праўду. Але большасць маіх дамоў устарэла. Пры маім жыцці. Гэта трагедыя для архітэктара. Мы ж усе марым тварыць на стагоддзі. Мне пяцьдзесят чатыры гады. Я маю вопыт... Я магу... І я хачу збудаваць раён, які адлюстроўваў бы нашу эпоху. Чорт, не люблю громкіх слоў! Я скажу табе прасцей. Комплекс гэты адлюстраваў бы нашу з табой радасць, радасць нашых дзяцей ад жыцця. А маё ўспрыняцце свету — я ўпэўнены— дало б радасць людзям, якія там жылі б. Хіба для гэтага не варта папрацаваць? Я разумею бязлітасны закон эканоміі. Я праектаваў самыя эканамічныя будынкі. Але больш не магу. Мяжа! Магчыма, не прыйшоў яшчэ час для пабудовы таго, што спраектавана ў маёй галаве. Але чаму можна іншым — у Маскве, у Вільнюсе? Чаму нельга мне?

Аб нарматывах Поля чула і ад мужа, і ад сына, і ад іх калег, маладых і старых, сто разоў. У эканамічных разліках праектаў яна разбіралася лепш за другога архітэктара. І, між іншым, будучы ашчаднай гаспадыняй, ведаючы цану грошам, якіх заўсёды не хапала, яна не падзяляла іх незадаволенасці нарматывамі, іх жаданне траціць дзяржаўныя грошы оез абмежаванняў. Але яна ніколі і нікому з іх не выказвала сваёй думкі на гэты конт. І лічыла, што Віктар, не ў прыклад маладым, самы разумны — ён хоць часам таксама бурчэў, аднак заўсёды клапаціўся пра кошт кожнага дома, які праектаваў. Нават Максіма папракаў. Не ў вочы яму. Ён сказаў, калі яны паглядзелі яго палац культуры: «Выдатны, канечне. Помнік. Але трыста тысяч звыш каштарысу...» —слова не знайшоў, што гэта такое, толькі пацмокаў і пакруціў галавой.

Што ж раптам здарылася?

Віктар змоўк. Няўжо чакаў ад яе адказу, чаму яму нельга спраектаваць такі раён, які будуюць у іншых гарадах? Быццам яна старшыня Дзяржбуда, не менш.

Яна сказала:

— Ты ж зрабіў палавіну працы. Год працуеш.

— Але гэтую працу ніхто не зацвердзіць. Я вылажу з нарматываў.

Поля ўздыхнула.

Баючыся, што яна забароніць яму зрабіць тое, што ён намерыўся, Віктар зноў пачаў пераконваць.

— Я мушу адмовіцца, Поля. Я больш не магу чыніць гвалт над сваім талентам. Ёсць жа ў мяне характар!

«Характар ёсць, волі мала», — падумала Поля, але змоўчала.

Віктар спытаў:

— Ты ведаеш, чым гэта можа скончыцца для мяне?

Поля расхутала рукі, узяла талерку і пачала асцярожна выціраць, беражліва, як вельмі каштоўную рэч, хоць талерка была самая танная, дзеці нямала іх білі, і яна ніколі іх не папракала, нават старэйшых, Веру і Толю, — не знарок жа. Але гэтымі асцярожнымі рухамі яна быццам давала адказ мужу, што добра разумее, як можа адбіцца на дабрабыце сям'і яго непрадуманы крок.

Голас Віктараў упаў, але ён усё яшчэ апраўдваў сябе:

— Добраму архітэктару не трэба пасады. Але галоўны архітэктар праекта — гэта не пасада. Гэта — прызнанне.

Поля адвярнулася ад ракавіны і адкруціла кран гарачай вады.

Віктар узлаваўся.

— Чаму ты маўчыш? Чаму адзін я павінен вырашаць, што рабіць? Усё я! Усё я! Адзін! За ўсіх вас!

У сапраўднасці без яе парады ён не вырашаў ніводнай дробязі: якую надзець сарочку, гальштук,

(Заканчэнне на стар. 13.)

Браніслаў СПРЫНЧАН

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

МЕТАЛ

Знайшоўшы ў лесе выцвілы патрон,
Падумаў я міжволі аб метале:
У ім дабро і зло ў патэнцыяле.
Ці не таму мяне трывожыць ён?
Калі шугае полымем ліццё,
Метал не знае, чым ён заўтра стане,
Прымае спакваля ў гарачым стане
Абліччы тых, хто даў яму жыццё.
Цябе ён можа ўзняць крылом тугім.
І можа, як няўмольная іголка,
Упіцца ў сэрца вастрыём асколка,
Гранатай грукнуць на шляху тваім.
Грыміць арганам і пяе трубой.
То рэйкамі пранізвае паўстанкі,
То зрокам абалваненай балванкі
Глядзіць увысь з упартасцю сляпой.
Ды ты сагрэй сваім агнём яго,
І ў цэху, дзе ён стане паслухмяным,
Шліфуй, пакуль у ім — перакаваным
Не ўспыхнуць іскры поспеху твайго.
Як ззяе плуг!
На ім святло зары
І ані кроплі зла ў патэнцыяле.
Пакінь на ім свае ініцыялы,
Аратаму на шчасце падары!

●

Як мне аддзячыць, адкажы ты,
Як адплаціць табе, скажы,
За старажытны водар жыта,
За гэты хлебны дух дзяжы.

Нябачны, ён дыхнуў здалёку,
Павёў у поле, паланіў.
І толькі там адкрыўся воку
У пераліве спелых ніў.

Так неабходны, так патрэбны
Нам гэты подых у жыцці.
Мацней, як дух, як водар хлебны,
На цэлым свеце не знайсці.

О дух зямны, з якім паўстала
Святло зярнят у збажыне,
Вярнуся ў цэх, ды пах метала
Цябе не пераб'е ва мне!

Перад жнівом, перад сяўбою
Не адступаючы нідзе,
Глядзіш — і зноў дыхне табою
Метал, што на лямеш ідзе.

Адвёўшы даўнія нягоды,
Ва мне мой горад і сяло
Змыкаюцца для добрай згоды,
Як з левым правае крыло.

У МІНСКУ

Яшчэ не сціхлі ліўня ўсхліпы,
А ўжо, глядзі, адлюстраваны
У вымытым асфальце ліпы,
Струменіцца іх пах духмяны.
У ім знікае чад бензіна —
Зямныя токі не аслаблі.
Акрэслены выразна ў сіні
Палацаў звонкія ансамблі.

На тварах мулярыў іскрыцца
Зара, адсоўваючы хмары.
У іх руках расце сталіца
З металу, каменя і мары.
Упісваецца ў непаўторны
Малюнак зелені лагоднай
Аўтамабільны і маторны —
Тут колеры ў суполцы згоднай.

Яны са сцягам дружаць гордым,–
Чырвоны над зялёным зверху.
Пад гэтым сцягам
крокам цвёрдым
Я ў цэх іду, як на паверку.
Хоць строгія ў дэталі грані,
Ды ў трапяткой палосцы зрэзу
І хараство блакітнай рані,
І ўпартасць добрага жалеза.

Тут вечны гул жыцця не моўкне.
І пах каштана і арэха,
Сюды даходзячы праз вокны,
Зліваецца з дыханнем цэха.

У перакованым жалезе —
Галінкі пахкай хруст ласкавы.
У цвет яе чмялі залезлі,
Нібы праніклі ў сутнасць з'явы,
Дзе, быццам у народнай песні,
Туга і радасць у хаўрусе,
Зялёны дым садоў Палесся,
І дым заводаў Беларусі.

Пераклаў П. МАКАЛЬ.

УСЁ ПРА СТАЛІЦУ

Ці ведаеце вы, што такое зона «Е» ў дзяржаўным банку? Нават сам кіраўнік не можа зайсці сюды без вялікай неабходнасці. Зона «Е» ўдзень і ўначы ахоўваецца. Ды і наогул у банку — гэтым «кашальку» горада, бывалі, бадай, нямногія. Адкрыйце дваццатую старонку кнігі А. Кудраўцава «Мінск і мінчане», і вы даведаецеся шмат цікавага пра «сумную» работу фінансістаў.

Аўтар запрашае нас «прайсці» па падземных мінскіх камунікацыях, пасядзець за кубкам піва з майстрам-піваварам, пазнаёміцца з лоцманам «пятага акіяна» і наведаць «палац шчаслівых».

На вокладцы кнігі пяць здымкаў. Твар дзяўчыны, якая смяецца, і аэрапорт — паветраныя «вароты горада», сталявары, шумная вуліца і ціхая лабараторыя вучонага... Гэта фотаработы аўтара кнігі, маладога журналіста Анатоля Кудраўцава.

«Мінск і мінчане» — зборнік рэпартажаў, якія па-новаму прымушаюць чалавека ўбачыць і ацаніць, здавалася б, ужо даўно знаёмыя з'явы і факты з жыцця беларускай сталіцы. Можна дзесяткі разоў праходзіць па мінскіх вуліцах і не заўважыць таго, што фіксуе ўважлівы аб'ектыў рэпарцёра і памяць журналіста. Можна сустракацца з чалавекам многія гады і не ведаць яго запаветных думак. Можна і проста не ведаць, што ў доме, які выглядае зусім звычайна, адбываліся падзеі значныя і нават гераічныя...

У кнізе А. Кудраўцава шмат здымкаў, якія лёгка запамінаюцца. Яны выкананы на высокім прафесійным узроўні і з добрым густам. Адны з іх публікуюцца ўпершыню, другія паспелі ўжо абысці «краіны і кантыненты». Некаторыя і цяпер падарожнічаюць па Еўропе. Аўтар — удзельнік многіх фотавыставак у СССР, ЗША, Францыі, Італіі, Польшчы, ФРГ, арганізаваных агенцтвам друку «Навіны». З яго цікавымі лаканічнымі рэпартажамі знаёмы чытачы «Комсомольской правды» і «Известий», «Советского спорта», часопіса «Смена».

Мова кнігі «Мінск і мінчане» часам скупаватая. Але затое шмат умела знойдзеных дэталяў.

«Многія дзесяцігоддзі над Мінскам панавалі званіцы сабору на сённяшняй плошчы Свабоды. Потым — вышынны будынак Дома ўрада. Потым — тэлевежы на беразе Свіслачы. І цяпер вось — новая мачта ў Калодзішчах.

Яна «перарасла» вышынны шпіль Маскоўскага універсітэта, ленінградскую тэлевежу, Эйфелеву вежу ў Парыжы і, нарэшце, н'ю-йоркскую радыёмачту на вышыні самага высокага небаскроба ў свеце Эмпайр Стэйт Білдзінг.

Перш чым узняць мачту на такую вышыню, будаўнікі вымушаны былі накіравацца глыбока пад зямлю...»

Так пачынаецца кароткі расказ аб рабоце мантажнікаў-верхалазаў. І як ўсё ў гэтай кнізе, ён ілюструецца фатаграфіямі.

Усе знаёмствы з героямі ў кнізе адбываюцца натуральна і проста. А ў памяці застаюцца надоўга. У гэтым, бадай, галоўная задача рэпарцёра, які піша летапіс нашых будняў. Вось як пачынаецца рэпартаж «Сэрца просіць дапамогі» пра работу хірургаў:

«Памятаеце сцэну, калі Гамлет, цвёрда перакананы ў злачынстве Клаўдзія, прыходзіць да маці-каралевы? Яна гаворыць яму:

— О мілы Гамлет, ты рассёк маё сэрца.

А ён у адказ:

— Адкіньце ж вы благую
палавіну
І з лепшаю жывіце ў чысціні...

А гэтыя словы належаць урачу, выдатнаму даследчыку мінулага стагоддзя, славутаму Клоду Бернару:

— Сэрца перастае працаваць апошнім, нібыта чакаючы канца бітвы паміж жыццём і смерцю.

Як бачыце, ва ўсе стагоддзі сэрца было ў пашане як у паэтаў, так і ва ўрачоў...»

Журналіст добра адчувае дынаміку, рытм падзеі. Вось як ён малюе трывожнасць моманту ў рэпартажы «Неадкладная» спяшаецца на дапамогу»:

«Чатыры пары абцасаў узрываюць калідорную цішыню. Ляпаюць дзверцы «рафіка», гудзе матор. На паваротах час пачынае кідаць з боку ўбок. Дробныя каменьчыкі барабаняць па днішчы машыны. Зрэдку шафёр уключае сірэну, і я бачу, як твары праходжых адразу становяцца сур'ёзнымі, у вачах застывае трывога.

Мінула ўсяго чатыры хвіліны, як па рацыі паведамілі: «Паражэнне токам...»

У сваім ўсхваляваным расказе пра буднi савецкіх медыкаў аўтар нібы нанава адкрывае вядомыя факты, разглядаючы іх у незвычайным ракурсе. У гэтым прывабнасць яго рэпартажаў.

Радуе вялікі дыяпазон інтарэсаў журналіста. А. Кудраўцаў нямала паездзіў па краіне. Працаваў з парашутыстамі-спартсменамі на Паміры, сам узыходзіў на пік Леніна, бываў у геолагаў і рыбакоў, разам з лётчыкамі ўдзельнічаў у вымушаных пасадках, ішоў з плытагонамі па Енісеі.

«Мінск і мінчане» яго першая кніга. І кніга, безумоўна, цікавая і патрэбная. Яе з цікавасцю прачытаюць людзі розных узростаў і прафесій, мінчане і госці нашага горада. Яна будзе карысная для фотааматараў і пачынаючых журналістаў.

Я. ЛОГІНАЎ.

А. Кудраўцаў. «Мінск і мінчане». На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь», 1973.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Рыгору РЭЛЕСУ—60

23 красавіка пісьменніку Рыгору Рэлесу спаўнялася 60 год. З гэтага выпадку праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Рыгор Львовіч!

Сардэчна вітаем Вас і шлем свае віншаванні з нагоды Вашага шасцідзесяцігоддзя. Як літаратар, Вы прыйшлі да свайго юбілею з немалымі здабыткамі. На пачатку творчасці, — гэта было перад самай вайной, — выдалі два зборнікі вершаў на роднай яўрэйскай мове. Пасля вайны выйшла кніга вершаў «Бяроза пад акном» у перакладзе на беларускую мову Р. Барадуліна. Шмат друкавалася Вашых вершаў у часопісе «Саветыш Геймланд» («Савецкая Радзіма»), які выходзіць у Маскве на яўрэйскай мове.

У апошнія гады Вы паспяхова выступаеце ў жанры прозы. Пішаце пераважна на педагагічныя тэмы, аб вучобе і выхаванні маладога пакалення. Прыемна адзначыць, што ў аснову Вашых навел і апавяданняў ляглі назіранні, здабытыя Вамі за доўгі час настаўніцкай працы ў адной з рабочых вячэрніх школ Мінска.

Жадаем Вам, дарагі Рыгор Львовіч, новых творчых поспехаў, сонечнага настрою, добрага здароўя, шчасця, найлепшага здзяйснення ўсіх Вашых творчых і жыццёвых планаў».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае пісьменніку новых творчых поспехаў.

ЧАЛАВЕК БУЙНЫМ ПЛАНАМ

ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ Магілёўскага машынабудаўнічнага тэхнікума Хведар Мацькоў, галоўны герой нарыса В. Мыслівца «Задняпроўцы», папрасіўся, каб яго паслалі ў Сібір. І куды б ні закідваў лёс юнака, нідзе не шукаў ён зманлівага астраўка лёгкага шчасця, настойліва ішоў сцяжынкай бескарыслівага служэння людзям.

Цудоўным, чулым кіраўніком паказаў сябе Мацькоў на пасадзе парторга трэста «Лаўсанбуд». Ён паспяхова вытрымлівае прынцыповую «бойку» з начальнікам трэста, з «важнай асобай» П. Цімашэнкам, які дагэтуль не вельмі лічыўся з думкай парторгаў, прафоргаў, пабюкома, заклапочаны паляпшэннем выхаваўчай работы сярод моладзі, якая толькі набывае жыццёвую мудрасць. Хведар Мікалаевіч верыць у чалавека, умее прыкмеціць у кожным добрае, што заслугоўвае падтрымкі.

У нарысе адчуваецца сапраўднае жыццё з усімі яго складанасцямі, напісаны ён з адпаведным майстэрствам.

Мацькоў жыве клопатамі будоўлі, дапамагае людзям расці. Узаемаадносіны з гэтым чалавекам пакідаюць светлы след у душы многіх. Асабліва гэта адчувае рэдактар шматтыражкі Анатоль Гарбачоў. Ён «неаднойчы ўжо заўважаў, што пасля гаворкі з парторгам, нават спрэчкі з ім, у галаву нечакана прыходзілі самыя светлыя думкі. Гэта заўсёды радавала. Ён адчуваў сэрцам, што з кожным днём робіць сваю справу больш пэўна, менш нервуецца, амаль ніколі не спяшаецца, узнімаецца і шчадрэе душою. У гэтым было шчасце творчага чалавека».

Шчаслівыя моманты кантакту з парторгам перажылі і былы прараб, начальнік камсамольскага штаба будоўлі С. Шалай (справядлівасць, сумленнасць, дабрату, якім навучыўся ў бацькі, бачыць ён і ў характары Хведара Мікалаевіча), і брыгадзір, дэпутат гарсавета В. Плоткіна.

Неўзабаве дзеянне з кабінетаў пераносіцца на будаўнічую пляцоўку, на вытворчыя ўчасткі, у цэх доследных установак. Партыйныя важакі і тут умеюць убачыць і пазмагацца за добрае ў чалавеку. Гэта відаць хоць бы ў тым, як заахвочваецца дзейнасць брыгадзіра мулярaў Віктара Ганчарова, прадстаўнікоў сучаснай тэхнічнай інтэлігенцыі — інжынераў Віктара Самохіна і Вячаслава Лахтанава.

Узводзіцца гігант беларускай сінтэтыкі, ідзе мантаж абсталявання, аддзелка і падрыхтоўка аб'екту да пуску. На задняпроўскім полі побач з камбінатам вырас і другі гігант вялікай хіміі — «Лаўсанбуд». Вядома, узнікаюць складаныя праблемы тэхнічнага, вытворча-арганізацыйнага плана. Можа іх абыйшоў аўтар? Не, іх нямала ўзнімаецца ў нарысе: выхаванне і вучоба маладых кадраў, пошукі форм і метадаў падрыхтоўкі брыгадзіраў, ліквідацыя пралікаў у праектах, барацьба з прастоямі, перабоямі ў забеспячэнні аб'ектаў, уздым працоўнай дысцыпліны, сувязь інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых з вытворчасцю і іншыя. Як бачым, усё тут ёсць: і паказ складаных вытворчых сітуацый, што ўзнікаюць на будаўніцтве, і публіцыстычныя меркаванні аб розных праблемах. Аднак аўтар не натанае ў разборы і аналізе тэхнічных, вузкапрафесійных, гаспадарча-вытворчых канфліктаў, у цэнтры ўвагі яго — найскладанейшая праблема: станаўленне калектыву. Адштурхоўваючыся ад вытворчых сутыкненняў і супярэчнасцей, нарысіст ідзе да асэнсавання сацыяльна-этычнага, маральнага зместу праблем, якія нясе ў сабе навукова-тэхнічная рэвалюцыя.

Тэматычна блізкі гэтаму і нарыс «Наддзвінскі летапіс». Ён прысвечаны будаўнікам Полацкага нафтаперапрацоўчага завода. У цэнтры твора — вобраз Васіля Купчына. Ён адзін з першых прыехаў на будоўлю. Дагэтуль працаваў прарабам у Ашхабадзе, а тут — брыгадзірам. Сам Васіль такое паніжэнне ўспрыняў як належнае, а вось жонка, хоць і жартам, папракнула, зачапіўшы за жывое:

— А я і не ведала, што ў цябе залатыя рукі. Думала, што толькі разумная галава!

Але не пакрыўдзіўся Васіль. Каб лепш пазнаёміцца з будоўляй, ён гатовы пайсці ў радавыя бетоншчыкі, аб чым і прызнаецца жонцы. Найбольш падрабязна паказвае аўтар працу В. Купчына на пасадзе брыгадзіра. Спачатку гэта даецца яму нялёгка. З дваццаці падначаленых яму юнакоў і дзяўчат толькі двое ўмеюць трымаць у руках сякеру... Ён вучыць «зялёную» моладзь, як хутчэй авалодаць прафесіяй, змагаецца са спажывецкімі адносінамі да працы некаторых з іх, выхоўвае ініцыятыву, смеласць, гаспадарлівасць. Прыходзіць і поспех. Брыгада пачала выпускаць канструкцыі на часовым палігоне, дзякуючы рацыяналізатарству Купчына вырабляюцца жалезабетонныя дошкі таўшчынёй усяго 20—40 міліметраў.

Будоўля набірае тэмпы, удасканальваецца арганізацыя працы, паляпшаюцца жыллёвыя ўмовы. Нібыта настае пара душэўнага заспакаення і дабрабыту. Але ці ўсё так добра, як здаецца на першы погляд. У сэрцах герояў адбываюцца іншыя змены, змены маральнага плану. Многае занава пераасэнсоўваецца, штосьці зусім адмаўляецца. Адзін з герояў нарыса Іван Палетка разумее, што так, як ён жыве, далей жыць нельга. Урокі жыцця атрымаў і Вальдамар Лакшын, чалавек маральна няўстойлівы і чэрствы...

Ва ўсіх гэтых даследаваннях тонкага і складанага працэсу душэўнай перабудовы і ўзмужнення герояў было б яшчэ больш дакладнасці, хвалюючай чысціні і сардэчнасці, калі б аўтар больш пільна і паслядоўна прасочваў лёс юнакоў і дзяўчат, паказваў іх учынкі ва ўзаемазвязаных жыццёвых сітуацыях. Думаецца, што фрагментарнасць шкодзіць твору. Нарыс шмат выйграў бы, калі б аўтар больш уважліва аднёсся да лёсу некаторых людзей. Мімаходзь, напрыклад, расказваецца пра Пятра Блахіна, а яго імем названа вуліца. Праўда, вобраз крыху дамалёўваецца ва ўспамінах камсорга Каці Казаковай, але гэтага недастаткова, і шматлікія агульныя фразы аўтара, прысвечаныя гэтаму чалавеку, выглядаюць узвышанымі, але бяскроўнымі. Слаба прасочваецца шлях Мікалая Голуба да пасады парторга цэха. Дзейнасць маладога партыйнага важака павінна была больш зацікавіць нарысіста.

Ва ўсіх творах зборніка В. Мыслівец стварае партрэты сучаснікаў, паказваючы індывідуальныя характары, тыя ці іншыя рысы, якія больш за ўсё відаць у дзеянні. Аднак там, дзе аўтар уключае ў мастацкую тканіну невялікія нарысы-біяграфіі, ён збіваецца на ілюстрацыйнае апісальніцтва. Гэты прыём абцяжарвае, а часам заблытвае асноўную фабулу. Было б лепш, калі б людзі ўводзіліся ў нарыс не механічна, а ў першую чаргу ў сувязі з вырашэннем найбольш важных, складаных і супярэчлівых праблем маральнага і вытворчага плана.

Калі ў нарысе «Задняпроўцы» кідаецца ў вочы вельмі часты прыём паглыблення герояў ва ўспаміны аб сваім мінулым, то ў нарысах «Наддзвінскі летапіс» і «Агні Лукомля» адчуваецца занадта свабодная раскаванасць кампазіцыі. Гэта не толькі ўспаміны, але і пісьмы, хроніка падзей, маляўнічыя рэпартажы, эпізадычныя замалёўкі. Але добра, што і ў іх праяўляецца адзінства чалавека, як непаўторнай індывідуальнасці, з тэхнікай, даволі глыбока зачэрпваецца жыццёвы матэрыял, відаць, як людзі знаходзяць у працоўных будніх натхненне і паэзію.

Бывае, што аўтар нарыса аб вытворчасці захапляецца празмерным ужываннем тэхнічных назваў, апісаннем складаных тэхналагічных працэсаў, з-за якіх падчас не відаць герояў. Добра, што В. Мыслівец здолеў пазбегнуць гэтага распаўсюджанага недахопу. Ён усюды захоўвае меру ва ўжыванні тэхнічнай тэрміналогіі. Яго прамысловыя пейзажы, якія звычайна цяжка паддаюцца апісанню, удала ўплятаюцца ў тканіну твора і нясуць значную эмацыянальную нагрузку. У яго маляўнічым летапісе сучаснасці ўсюды наперадзе чалавек — уладар над тэхнікай, змагар за прыгожае ў жыцці, творца.

Нягледзячы на некаторыя стылістычныя недакладнасці, нарысы Валянціна Мыслівца напісаны вопытнай рукой пісьменніка-дакументаліста. Аўтар паказаў рабочага чалавека буйным планам.

Няблага будзе, калі за стварэнне мастацкай біяграфіі рабочага класа рэспублікі возьмуцца і іншыя нашы пісьменнікі, а таксама журналісты.

М. НЯХАЙ,
кандыдат філалагічных навук.

В. Мыслівец. «Рабочыя людзі». Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

НА МОВАХ БРАТНІХ НАРОДАЎ



Кнігі лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа шмат разоў выдаваліся на мовах народаў нашай краіны і за мяжой. Чытачы Румыніі, Польшчы, Эстоніі, Латвіі, Украіны, Фінляндыі, Англіі, Францыі, Іспаніі палюбілі іх. Цяпер творы пісьменніка рыхтуюцца да выдання ў Літве і Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

На гэтых здымках вы бачыце вокладкі некаторых з гэтых выданняў: на рускай мове «Людзі на балоце» (аўтарызаваны пераклад М. Гарбачова) і «Подых навальніцы» (аўтарызаваны пераклад Д. Кавалёва, мастак В. Кочкін, выдавецтва «Советский писатель»), на малдаўскай — «Подых навальніцы» (пераклад Е. Давід і Л. Батыр, мастак С. Саланар), на балгарскай — «Людзі на балоце» (пераклад І. Сакалова). Кніга выйшла ў выдавецтве «Народна култура» ў серыі «Выбраныя раманы».

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

АДЗІН З АБУДЖАНЫХ РЭВАЛЮЦЫЯЙ

ДА 80-ГОДДЗЯ ВАСІЛЯ ГАРБАЦЭВІЧА

Першыя паслякастрычніцкія дні, першыя дэкрэты новай, рабоча-сялянскай, Савецкай улады аб міры і вайне, аб зямлі, аб асвеце і адукацыі. Новае жыццё прыйшло і ў вёску Дукора Ігуменскага павета Мінскай губерні, дзе ў той час (пачынаючы з 1918 г.) настаўнічаў дваццаціпяцігадовы малады чалавек, ураджэнец гэтых мясцін Васіль Савіч Гарбацэвіч, сялянскі сын, якому яшчэ да рэвалюцыі пашчасціла «выбіцца ў людзі» — закончыць Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю ў 1913 годзе і нават вучыцца ў Мінскім настаўніцкім інстытуце (1915—1918 гг.).

Улюбёны ва ўсё роднае, беларускае, улюбёны ў мастацкую літаратуру, надзелены прыродай талентам мастака і адчуваючы патрэбу выказацца, ён, як і многія маладыя людзі беларускай вёскі таго часу, бярэцца за пяро пісьменніка, спрабуе свае сілы ў жанры драматургіі. У выніку ў 1921 годзе з'яўляецца яго першы літаратурны твор — п'еса «Вяселле», напісаная на матэрыяле вуснай народнай творчасці беларусаў. У тым жа годзе першая п'еса маладога драматурга ўбачыла сцэну Беларускага дзяржаўнага тэатра, які толькі што адкрыўся ў Мінску.

У пачатку 20-х гадоў поруч з развіццём сацыяльна-бытавой і гістарычнай драмы ў беларускай літаратуры пачынае зараджацца жанр героіка-рэвалюцыйнай драмы, якая адлюстроўвае падзеі нядаўняга мінулага — героіку грамадзянскай вайны. І першым з беларускіх драматургаў, хто паспрабаваў свае сілы ў гэтым жанры, быў дукорскі настаўнік Васіль Гарбацэвіч, аб чым сведчыць яго п'еса «Чырвоныя кветкі Беларусі» (1923).

Гэта быў другі і самы лепшы драматычны твор пісьменніка. У ім аўтар паказаў гераічныя справы беларускай моладзі ва ўмовах акупацыі Беларусі белапалякамі ў 1919—1920 гг. У аснову п'есы ляглі сапраўдныя падзеі, што адбыліся вясной 1920 г. у вёсцы Дукора, на радзіме пісьменніка.

У драмы «Чырвоныя кветкі Беларусі» — зайздроснае сцэнічнае жыццё. На працягу амаль дваццаці даваенных год яна з поспехам ставілася на самадзейнай сцэне бадай ва ўсіх раёнах Беларусі.

Пяру В. Гарбацэвіча належаць яшчэ два драматычныя творы: сацыяльна-бытавая п'еса «Пад вішнёвымі садкамі», напісаная ў час яго працы ў Магілёўскім педтэхнікуме (1924—1929) і апублікаваная ў 1927 г. у «Дняпроўскіх усплёсках» — друкаваным органе магілёўскай філіі «Маладняка», якую ён тады ўзначальваў, і п'еса пра калектывізацыю «Песні нашых дзён», якая выйшла асобным выданнем у 1930 г.

Пасля заканчэння ў 1933 годзе Мінскага педагагічнага інстытута, В. Гарбацэвіч стала працуе ў Дукорскай школе аж да 1957 года. Перапынак вымушаны быў зрабіць толькі на перыяд Вялікай Айчыннай вайны, калі яму, салдату стралковага палка Першага Украінскага фронту, давялося змагацца з фашысцкімі захопнікамі. У 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра пад Каневам ён быў кантужаны, а потым аж да Дня Перамогі працаваў санітарам у палявым шпіталі. Як удзельнік вайны, узнагароджаны баявымі медалямі.

Шмат зроблена Васілём Гарбацэвічам і на ніве народнай асветы, на якой ён каля 40 год сеяў разумнае, добрае, вечнае. За гэту вялікую і высакародную працу Савецкі ўрад узнагародзіў яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а ўрад нашай рэспублікі прысвоіў яму ганаровае званне заслужанага настаўніка БССР.

Антон СЕМЯНОВІЧ.

Ідзе трэці, рашаючы год дзевятай пяцігодкі. Паўсюдна — у горадзе і вёсцы, на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах — працоўныя рэспублікі памнажаюць свае дасягненні, заваёўваюць новыя вышыні ў вытворчасці прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, у стварэнні матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, у паспяховым будаўніцтве камуністычнага грамадства.

А які ўдзел у гэтым стваральным працэсе прымаюць кінадакументалісты? Як адлюстроўваюць працоўны подзвіг нашага сучасніка? Што цікавага зроблена імі ў баявым жанры кінапубліцыстыкі?

ЗДЫМАЧНАЯ ПЛЯЦОЎКА —

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

Алесь МАЦКЕВІЧ

НАТАТКІ АБ РАБОЦЕ ТВОРЧАГА АБ'ЯДНАННЯ «ЛЕТАПІС» СТУДЫІ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ

НА ПЯРЭДНІМ РУБЯЖЫ — «ХРАНІКЁРЫ»

Сёлета ў кіначасопісе «Савецкая Беларусь» з'явілася спецыяльная рубрыка: «Пяцігодка, год трэці, рашаючы». Глядач пазнаёміўся з самымі разнастайнымі дасягненнямі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры. Пры гэтым асаблівая ўвага звяртаецца на шырокае асвятленне сацыялістычнага спаборніцтва.

Так, у першым кінавыпуску старшыня калгаса імя Калініна Нясвіжскага раёна Я. В. Аляксанкін расказвае аб спаборніцтве земляробаў і жывёлаводаў за павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў, аб тым, як даярка Ніна Адамаўна Сюдук абавязалася надаіць ад кожнай фуражнай каровы па 3.500 кілаграмаў малака. Гэта не проста словы, а рэальная магчымасць. І ў кіначасопісе прыводзяцца пераканаўчыя эканамічныя разлікі.

За павелічэнне вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі спаборнічаюць і вучоныя Беларускага інстытута земляробства. Селекцыянер В. Я. Ласянкова, напрыклад, стварыла новыя гатункі яравой пшаніцы. Ёй быў прысвечаны сюжэт кіначасопіса. Там гаварылася, што тэарэтычная і практычная дзейнасць навуковых спецыялістаў не спыняецца ні на адзін дзень.

Змяшчаюцца ў «Савецкай Беларусі» сюжэты аб спаборніцтве беларускіх прадпрыемстваў з прадпрыемствамі іншых рэспублік, скажам, Мінскага і Талінскага радыёзаводаў. У выступленнях кіраўнікоў і рабочых, знятых на кінаплёнку сінхронна, вобразна раскрываецца карціна барацьбы за датэрміновае выкананне вытворчых планаў працоўнымі калектывамі двух братніх народаў нашай краіны.

Варта адзначыць, што работнікі кінахронікі імкнуцца не проста фіксіраваць, а даследаваць падзеі. Нярэдка праз пэўны час яны вяртаюцца да іх зноў з тым, каб прасачыць шлях росту, развіцця і станаўлення. Так было з Мазырскім нафтабудам, Баранавіцкім заводам аўтаматычных ліній, камбінатам «Беларуськалій» і іншымі аб'ектамі, зацікавіўшымі кінахранікёраў. А яны разумеюць, што для паказу імклівага сучаснага жыцця, тых змен, якія адбываюцца на нашай зямлі, патрэбна ўдасканальваць і ўзбагачаць прафесійнае майстэрства. Назіраецца добрая тэндэнцыя паглыбляцца ў матэрыял, рабіць кіначасопісы больш аналітычнымі.

Вытворчыя працэсы, як вядома, не павінны засланяць чалавека, героя нашага часу. Хранікёры заўсёды раскрываюць яго рашаючую ролю ў стваральнай працы, паказваюць «буйным планам».

...Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод. За дзесяць гадоў існавання вырасла і пашырылася прадпрыемства. А з ім выраслі і людзі. Тут пачынаў сваю працоўную біяграфію Аляксей Герасіменка. Без адрыву ад вытворчасці закончыў інстытут. Нядаўна яго прынялі ў рады КПСС.

Або ўзяць Любу Будзько. Яна таксама з рабочых-будаўнікоў, а зараз — вядучы спецыяліст на прадпрыемстве.

Так, аператары засяроджваюць увагу гледача на людзях. Часам ім удаюцца цікавыя партрэты і нават своеасаблівыя навелы. Паступова адыходзіць на другі план напісаны канцылярскай мовай дыктарскі тэкст. Усё часцей можна пачуць жывое чалавечае слова «пра самога сябе» ці яго таварышаў. Тое, што прынята называць сінхронным тэкстам, з кожным днём пракладае шырокі шлях, творча дапаўняе выяўленчыя сродкі, робіць кіначасопіс глядзельна-прывабным, змястоўным.

Праўда, пакуль яшчэ нельга сказаць, што кіначасопіс «Савецкая Беларусь» цалкам адпавядае надзённым патрабаванням як у тэматычным сэнсе, так і ў сэнсе кінапубліцыстычнага майстэрства. Адсутнасць у аб'яднання «Летапіс» сваіх карэспандэнцкіх пунктаў у абласных цэнтрах і буйных гарадах рэспублікі пазбаўляе яго магчымасці своечасова, аператыўна адлюстроўваць найбольш значныя падзеі, служыць прычынай таго, што на экран трапляюць часам другарадныя факты, сюжэты, якія не заўсёды маюць пэўнае грамадска-палітычнае або мастацка-эстэтычнае значэнне.

Не спрыяе справе і тое, што матэрыялы для яго здымаюць толькі асобныя аператары, можна сказаць, энтузіясты. У мінулым — гэта М. Бераў, Ф. Осіпаў, У. Цяслюк, зрэдку В. Шаталаў. Цяпер «штатнымі» аператарамі, як правіла, лічацца Ю. Іванцоў і У. Пужэвіч. Відаць, кіначасопіс значна выйграў бы, калі б здымкі для яго рабілі аператары з розным творчым почыркам.

Гэтае самае можна сказаць і пра рэжысёраў. За кіначасопісамі «замацоўваюцца» галоўным чынам тыя, хто ў «прастоі», або каму няма чаго рабіць. А некаторыя «масцітыя» лічаць не такой ужо ганаровай справай унесці сваё прозвішча ў цітры кінаперыёдыкі і нават іншы раз не хочуць дапамагчы добрым словам маладым кінажурналістам. Тут ужо не пазайздросціш аддзелу кінахронікі...

Добра было б, каб тыя ж вопытныя рэжысёры, на рахунку якіх нямала самастойных фільмаў, часцей браліся за стварэнне стужак кінаперыёдыкі. Ды яшчэ выязджалі на месцы здымак, выступалі там арганізатарамі ўсяго творчага працэсу. Гэта, на жаль, не практыкуецца.

На нядаўнім пленуме Саюза кінематаграфістаў БССР выказвалася нават думка аб тым, ці мэтазгодна выпускаць штомесячны кіначасопіс «Савецкая Беларусь», улічваючы, маўляў, звышаператыўную ролю тэлебачання, якое ідзе па гарачых слядах жыцця і намнога раней, чым кіно, выдае іх на блакітны экран.

З гэтай думкай нельга пагадзіцца. Бо кінаперыёдыка з першых дзён свайго нараджэння заўсёды была і застаецца баявым жанрам савецкага кінематографа.

Хіба ж не ясна, што калі кожная стужка будзе зроблена з добрым мастацкім густам, публіцыстычным запалам, на высокім прафесійным узроўні, з шырокім выкарыстаннем не толькі творчых магчымасцей, але і тэхнічных дасягненняў сучаснай кінатэхнікі, а галоўнае, калі яна раскажа пра цікавыя, хвалюючыя падзеі, то тут няма чаго баяцца канкурэнцыі з тэлевізійнымі выпускамі.

Вось чаму адбор матэрыялу, аб'екта, пошук героя — рашаючае звяно ў дзейнасці стваральнікаў кіначасопіса. Ад гэтага перш за ўсё залежыць, стане знятае на плёнку даўгавечным, ці прамільгне « як у кіно».

Шмат трэба зрабіць аб'яднанню «Летапіс», каб кіначасопіс «Савецкая Беларусь» больш адпавядаў патрабаванням сённяшняга дня, каб ён больш глыбока адлюстроўваў бурлівае жыццё сучаснасці. Сустрэчы, гутаркі з дакументалістамі пераконваюць, што яны імкнуцца да гэтага.

ГЕРОЙ ФІЛЬМА — «АТАКУЮЧЫ КЛАС»

Кіначасопіс — самы аператыўны жанр. А тыя, хто стварае яго, — першыя разведчыкі, шукальнікі новага, цікавага, што ўвойдзе потым у арганічную тканіну кінатвора.

І ўсё ж экраннае жыццё кінаперыёдыкі зусім кароткае — усяго шэсць месяцаў. Пасля гэтага тэрміну стужка кладзецца на студыйную фільматэчную паліцу, дзяржаўнага архіву кінафотадакументаў.

Таму перавага дакументальнага фільма перад хронікай відавочна. Кінанарыс, кінарэпартаж, кінапартрэт — даволі распаўсюджаная форма гэтага самастойнага жанру — даюць шырокія магчымасці для адлюстравання шматграннага жыцця. І дакументалісты імкнуцца паўней выкарыстаць іх у сваёй практычнай дзейнасці. Знаёмства з кінапрадукцыяй апошняга часу ўсё больш пераконвае ў гэтым. Калі размеркаваць яе тэматычна, то ўзнікае наступная карціна: фільмы аб рабочым класе, працаўніках сяла, навукова-тэхнічным прагрэсе, аб сучаснай інтэлігенцыі. Кінапубліцысты закранаюць ключавыя праблемы, тое, што хвалюе нашу грамадскасць, над чым працуюць рабочыя, калгаснікі, усе савецкія людзі.

У свой час, яшчэ напярэдадні дзевятай пяцігодкі, на экраны рэспублікі выйшаў кінанарыс «Дні Івана Нікалаева» (аўтар сцэнарыя А. Браілоўскі, рэжысёр А. Канеўскі, аператар Э. Гайдук). У яго аснове — расказ аб простым будаўніку, нашым сучасніку І. Д. Нікалаеву. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён партызаніў. А калі Мінск быў вызвалены ад захопнікаў, вярнуўся ў родны горад, каб аднаўляць яго, падымаць з руін.

...Ліпень 1944... Партызанскі парад у разбуранай беларускай сталіцы. У тым страі ішоў таксама Іван Дзімітрыевіч. Балела сэрца, гледзячы на папялішчы, на счарнелыя ад дыму каробкі дамоў. І Нікалаеў змяніў зброю на кельму, разам з тысячамі рускіх, украінцаў, якія прыехалі на дапамогу, пачаў занава будаваць горад.

Зараз на многіх будоўлях Беларусі і іншых рэспублік працуюць вучні, выхаванцы І. Д. Нікалаева. Добрае зерне пасеяў гэты чалавек! Часта ветэрану даводзіцца выступаць перад маладымі будаўнікамі, перадаваць ім свой шматгадовы вопыт. Нярэдка яму задаюць пытанне: чаму вы, Іван Дзімітрыевіч, абралі менавіта гэту прафесію? У такіх выпадках ён прыгадвае партызанскія часіны, баявы атрад і той незабыўны дзень, калі яго прымалі ў партыю: кім ты хочаш быць пасля вайны? «Будаўніком», — доўга не думаючы, адказаў Нікалаеў.

Кінанарыс «Дні Івана Нікалаева» падкупляе сваёй непасрэднасцю, шчырасцю, цеплынёй. Аўтары памайстэрску выкарыстоўваюць выяўленчыя сродкі для паказу дзейнасці простага чалавека, раскрыцця яго характару. Ім на дапамогу прыходзяць нават фільматэчныя кадры, як сродак характарыстыкі эпохі, даўно пройдзенага этапу. Аднак, улічваючы, што колькасць такіх кадраў вельмі абмежавана, дакументалісты выкарыстоўваюць іншыя магчымасці. У цэнтры ўвагі — успаміны Івана Нікалаева. Такім чынам аднаўляецца мінулая дзейнасць рабочага і, паказваецца яго сённяшняе жыццё, праца, быт.

Хвалюючая кінастужка А. Браілоўскага і А. Канеўскага — адна з тых, што дала добры пачатак расказу з экрана аб рабочай дынастыі, аб тых, хто сваёй самаадданай працай услаўляе нашу краіну.

У фільме «Дом майстроў», знятым па сцэнарыі Л. Ляонава, рэжысёр А. Канеўскі яшчэ раз звяртаецца да рабочай тэматыкі. Героі кінарасказа — навучэнцы Бабруйскага мастацкага прафесійна-тэхнічнага вучылішча. Пройдзе час, і яны паедуць па прадпрыемствы краіны, папоўняць шматмільённую армію рабочага класа. Некаторым з іх, старшакурснікам, выпадзе гонар завяршаць дзевятую пяцігодку, астатнія прымуць эстафету пазней.

Каго рыхтуе вучылішча? Адны выпускнікі будуць сталярамі, другія рэзчыкамі, трэція — абліцоўшчыкамі, чацвёртыя — інкрустатарамі па дрэву, мастакамі-дэкаратарамі... Розныя спецыяльнасці, але сацыяльная прыналежнасць адна: рабочы.

Кадр за кадрам знаёміць гледача з тым, як вучні авалодваюць тэарэтычнымі ведамі, як падмацоўваюць іх на практычных заняткох, на нашых вачах вырабляюць такія рэчы, што, здавалася б пад сілу толькі даросламу і вопытнаму майстру. Кавалак дрэва ў руках юнака набывае новае жыццё, новую форму, робіцца прадметам мастацтва.

Дарэчы, работы навучэнцаў Бабруйскага МГПТВ неаднаразова экспанаваліся на Выстаўцы дасягненняў



Кадры з фільма «Асноўнае звяно».

207.600 КВАДРАТНЫХ КІЛАМЕТРАЎ

народнай гаспадаркі СССР, і нават у Канадзе, Японіі, Фінляндыі, Югаславіі, Чэхаславакіі. Восем дыпломаў, больш як дзвесце медаляў — такі вынік карпатлівай працы нястомных маладых вынаходцаў.

Аўтары фільма паказваюць арганічную сувязь народнай творчасці мінуўшчыны з творчасцю нашых сучаснікаў, гавораць аб яе вытоках, пераемнасці традыцый, падкрэсліваюць, што без гэтага не можа існаваць і развівацца ніякае мастацтва.

Галоўны расказчык у фільме — сам дырэктар вучылішча А. Я. Ларын. Яго кінаманалог напоўнены цікавымі звесткамі, прыкладамі, параўнаннямі. І не дзіва. «Праз рукі» Аркадзя Яфімавіча прайшло каля трох тысяч выхаванцаў, якія працуюць у розных галінах айчыннай прамысловасці. А пройдзе час, і ў адзін шэраг з імі стануць малодшыя калегі.

Глядзіш на экран і верыш, што сённяшнія навучэнцы будуць кваліфікаванымі спецыялістамі, з высокім інтэлектам, добрым эстэтычным густам. Аўтарам стужкі, не гледзячы на яе асобныя пралікі, на вопыце адной навучальнай установы ўдалося паказваць, як на сучасным этапе вырашаецца праблема падрыхтоўкі рабочых кадраў. Гэта новае слова ў беларускім дакументальным кіно.

...Калі ў зале гасне святло, і на экране ўзнікае надпіс «Стварыце зноў веласіпед», то не адразу разумееш, што гэтыя словы значаць? Нібы назва рэкламнага фільма ці роліка.

Аказваецца, дакументалісты «інтрыгуюць» гледача. Бо за назвай — цікавая па зместу і форме кінастужка. На першы погляд, нават тады, калі ўрэшце пачалася дзея, у кадрах быццам нічога не адбываецца. Мы бачым простага чалавека з дынастыі стругальшчыкаў, гаворыць ён пра сябе, сваіх таварышаў і вучняў. Развіваючы кінарасказ па ўзыходзячай лініі, аўтары падаюць звесткі адну цікавей другой. Пры гэтым яны амаль не карыстаюцца дыктарскім тэкстам. Усё «трымаецца» менавіта на ўласных словах Патаповіча. Словы не толькі інфармацыйнага характару, а і глыбокага роздуму аб надзённых справах, якія аднолькава хвалююць кіраўнікоў і іх падначаленых. Асноўная думка зводзіцца да таго, што рабочы, дзе б ён ні працаваў, павінен быць высокакваліфікаваным.

Стругальшчык Патаповіч не толькі вучыцца сам, але і вучыць іншых «навічкоў».

Так простымі, даходлівымі сродкамі майстры дакументальнага экрана «лепяць» кінапартрэт героя нашага часу — героя пяцігодкі. У ім, як у фокусе аб'ектыва, яны адлюстроўваюць усенародны рух за навукова-тэхнічны прагрэс, за паспяховае выкананне дзевятай пяцігодкі.

Важнай падзеяй трэба лічыць стварэнне кінаальманаха «Галоўная вуліца», які аб'ядноўвае чатыры прасякнутыя адной думкай навелы. Дзве першыя «Партызанскі праспект» і «Я — мільёнпы» — ужо закончаны. Умоўныя назвы астатніх — «Палітычны прадстаўнік» і «Нараджаецца песня» — знаходзяцца ў вытворчасці. Нядаўна кінаэкспедыцыя, якую ўзначальвае рэжысёр Ю. Лысятаў, выехала на поўнач нашай краіны, дзе праходзяць выпрабаванні беларускіх аўтамабіляў.

Героі гэтага альманаха — рабочыя, інжынеры, канструктары, прадстаўнікі навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі.

Інтэлігенцыі прысвечаны і іншыя кінастужкі. Так, рэпартаж «Прызначаны дырэктарам» (аўтары сцэнарыя В. Марозаў, В. Шаталаў, рэжысёр-аператар В. Шаталаў) расказвае пра інжынера А. Малахава, які пасля рэарганізацыі калійнага камбіната стаў дырэктарам першага рудаўпраўлення; той жа А. Канеўскі ў фільме «Нараджаецца «Віхар» паказаў стваральнікаў новага сельскагаспадарчага агрэгата — камбайна.

А ў цэнтры нарыса «Рэчанька» — малады інжынер А. Мураўскі. Пад яго кіраўніцтвам ажыццяўляецца праект збудавання Вілейска-Мінскай воднай сістэмы, злучэння рэк Віліі і Свіслачы.

НА ЭКРАНЕ — СЕЛЬСКІЯ ГАРЫЗОНТЫ

Паказ дасягненняў сельскай гаспадаркі рэспублікі, працаўнікоў вёскі займае належнае месца ў арсенале кінапубліцыстаў. Гэтай тэме падпарадкаваны ўсе тры жанры не іграваго кіно — дакументальнае, навукова-папулярнае і вучэбнае.

Адразу адзначым, што прыхільнікам першага жанру ў колькасных адносінах выхваляцца асабліва няма чым. Лепшае, што зроблена ў гэтай пяцігодцы, — гэта «Факел», «Вольныя» майстры» і «У дзень зарплаты». Астатняе прыпадае на долю навукова-папулярнага і вучэбнага кіно.

Як відаць з самой назвы стужкі, дзея адбываецца ў адзін дзень. К. А. Пінчук атрымлівае ў банку грошы, вяртаецца ў сваю гаспадарку і тут раздае «палучку». Такім чынам, за аснову ўзяты лакальны жыццёвы факт, а думка на ім прасочваецца давялікая: толькі ў працы чалавек дасягае мэты, паляпшае і ўпрыгожвае сваё жыццё і жыццё ўсяго народа. Аўтары падкрэсліваюць, што значная доля гэтага поспеху прыходзіцца на дзевятую пяцігодку.

Аналізуючы прадукцыю кінапубліцыстыкі, робіш выснову, што вядучая, калі не сказаць, галоўная роля ў асвятленні сельскагаспадарчай тэматыкі належыць навукова-папулярным і вучэбным фільмам. У ліку лепшых варта назваць «Мікраклімат на фермах» (аўтар сцэнарыя Ю. Бясхлебнаў, рэжысёр Л. Матусевіч, аператар М. Южык), дзе разглядаюцца важнейшыя ўмовы павышэння прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

Стварэнню сельскагаспадарчых фільмаў аддаюць свае здольнасці і энергію многія кінематаграфісты. Скажам, С. Браўдэ амаль цалкам прысвяціў сябе гэтай справе. Праблемы асушэння балот, асваення тарфянікаў, меліярацыя — яго «канёк», яго генеральная тэма. У «Нараджэнні новага Палесся» (сцэнарыст Х. Петэрсон, аператары Г. Шынгер, Ф. Осіпаў) ён прапагандуе прагрэсіўныя метады асушэння беларускага Палесся. А ў сваёй новай рабоце «Асноўнае звяно» дае своеасаблівае даследаванне праблемы, выказвае навуковыя рэкамендацыі па асваенню прыроднага комплексу. Рэжысёр сцвярджае, што велізарным водным балансам гэтага краю можна кіраваць, што рэгуляванне вільготных глебаў — гэта новая задача, а ўсе папярэднія метады састарэлі. Адначасова ставіцца пытанне аб неабходнасці захавання Палесся як запаведніка.

Яму, С. Браўдэ, належыць яшчэ адна даволі цікавая і патрэбная стужка — «Шматгадовы лубін» (сцэнарысты К. Доўбан, С. Браўдэ, аператар Г. Шынгер), дзе разглядаецца агратэхніка вырошчвання гэтай культуры, яе шырокае выкарыстанне ў сельскай гаспадарцы.

У творчым аб'яднанні «Летапіс» штогод выпускаецца некалькі вучэбных фільмаў. Гэта — як бы фільмы-рэкамендацыі, фільмы-інструкцыі, фільмы-парады па тых ці іншых пытаннях сельскагаспадарчай вытворчасці. Звычайна самі назвы гавораць аб іх тэматычнай накіраванасці. Напрыклад, «Пярвічная апрацоўка льну», «Машыны для пасеву і ўборкі льну» і іншыя.

Але, як лепшае дасягненне тых, хто працуе ў вучэбным кіно, хацелася б адзначыць карціну «Падсобныя прадпрыемствы ў калгасах і саўгасах» (сцэнарысты У. Рабцаў, У. Шэлег, рэжысёр У. Шэлег, аператары Б. Алёшкін, Ю. Іванцоў), — расказ аб перадавых гаспадарках рэспублікі, якія шырока выкарыстоўваюць унутраныя рэзервы для развіцця эканомікі. Гэта не проста інструкцыя, а твор, дзе ставіцца і на канкрэтных прыкладах раскрываецца дзяржаўная праблема.

На жаль, пра некаторыя фільмы гэтага нельга сказаць. Бо яны павярхоўныя, ілюстрацыйныя, неглыбокія. Аднак настойлівыя пошукі, паўсядзённая карпатлівая праца кінематаграфістаў не спыняецца ні на адзін дзень. Усё падпарадкавана адной задачы: глыбей паказваць на экране спалучэнне навукі з практыкай, адлюстроўваць плённы ўплыў на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, на паспяховае выкананне задач, якія пастаўлены перад працаўнікамі сяла ў дзевятай пяцігодцы.

Кінастужка «Факел» (сцэнарыст М. Вінагораў, рэжысёр В. Сукманаў, аператар А. Аўдзееў) расказвае пра вёску на Магілёўшчыне, якая называлася раней Ліхнічы, а зараз перайменавана ў Ракушава, у гонар В. І. Ракушава, загінуўшага разам з сынамі ад кулацкай кулі ў часы калектывізацыі. Аўтары расказваюць аб вялікіх, радасных зменах, што адбыліся на гэтай зямлі дзякуючы калгаснаму ладу, аб заможным жыцці аднавяскоўцаў і нашчадкаў патрыёта.





Кадры з фільмаў «Падсобныя прадпрыемствы ў калгасах і саўгасах» і «У дзень зарплаты».

Другі кінапарыс «У дзень зарплаты» можна назваць своеасаблівым працягам «Факела». Паміж адлюстраванымі ў іх падзеямі — дыстанцыя ў некалькі дзесяцігоддзяў. Але параўноўваючы іх, пераконваешся, які поспех, маштаб, зрух заваяваны за гэты перыяд нястомнай працай калгаснага сялянства.

Стваральнікі фільма не робяць ніякіх экскурсаў у мінулае, не насычаюць яго мноствам лічбаў, фактаў, прыкладаў, што так уласціва некаторым дакументалістам. У гэтай стужцы адзіны галоўны герой — касір калгаса «Новы быт» Мінскага раёна — Канстанцін Андрэевіч Пінчук. Яго вуснамі аўтары і расказваюць аб росце матэрыяльнага дабрабыту людзей. Ад нізкааплачваемых працадзён да грашовай аплаты, да 270—400 і больш рублёў у месяц, — вось такі пройдзены шлях. Ці трэба гаварыць, што гэты паказчык — самае яркае адлюстраванне працоўных перамог ва ўсіх галінах гаспадаркі.

...Кожны дзень вядуцца здымкі сюжэтаў для кіначасопісаў, а таксама хранікальна-дакументальных, навукова-папулярных і вучэбных фільмаў. Усюды можна сустрэць нястомных аператараў «Летапісу». А здымачная пляцоўка ў іх вялікая — 207,6 тысячы квадратных кіламетраў — плошча нашай рэспублікі.

ДЫПЛОМЫ — СТВАРАЛЬНІКАМ ФІЛЬМАЎ

На студыі «Беларусьфільм» завяршыўся агляд-конкурс кінастужак, створаных тут у мінулым годзе. На працягу шасці дзён перад работнікамі студыі і іх гасцямі — рабочымі мінскіх прадпрыемстваў, журналістамі, студэнтамі, школьнікамі — прайшло адзінаццаць мастацкіх і тэлевізійных фільмаў, каля 80 хранікальна - дакументальных і навукова-папулярных стужак трох творчых аб'яднанняў.

На заключнай творчай канферэнцыі агляду-конкурсу лепшай у мастацкім кінематографе была прызнана рэжысура А. Карпава і яго славацкага калегі М. Цяпака ў сумесным савецка-чэхаславацкім фільме «Заўтра будзе позна».

Сярод дасягненняў аператараў журы адзначыла здымкі Ю. Марухіна ў фільме «Хроніка ночы». Лепшым мантажорам яно назвала Л. Кузміч, якая працавала над карцінай «Вуліца без канца».

У калектыве «Тэлефільма» поспеху дабіліся стваральнікі шматсерыйнай стужкі «Руіны страляюць». Шэсць з іх названы лепшымі па прафесіі.

У ліку кінематаграфістаў, удастоеных дыпломаў першага агляду-конкурсу, больш за 20 супрацоўнікаў творчага аб'яднання «Летапіс».

Пераможцаў агляду-конкурсу павіншаваў старшыня Камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі У. В. Мацвееў.

БЕЛТА.

МАЙСТЭРСТВА, ГУСТ, ТАЛЕНТ

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

У ЦЕСНАЙ франтавой зямлянцы б'ецца, трапеча чырванаватае святло самаробнага каганца. Спяць салдаты, стомленыя боем. А ля самаробнага стала, змайстраванага з двух негабляваных дошак — пажылы рыжавусы сержант у пабялелай, старэнькай пілотцы, з аўтаматам на грудзях, з медалём «За баявыя заслугі». Сержант сядзіць чынна, баіцца варухнуцца — пазіруе. Сёння ў рукапашнай ён забіў двух «фрыцаў» і камандаванне прапанавала змясціць яго партрэт у армейскай газеце «В бой за Родину». Павольна цячэ час. Сержант стаміўся, вочы самі заплюшчваюцца, але ён трымаецца. Малады, ладны хлапчына, мастак Віктар Сахненка заканчвае работу. Адкідае галаву назад, прыжмураецца, кладзе на паперу апошнія штрыхі. Яму яшчэ трэба паспець у рэдакцыю і да раніцы выразаць гэты партрэт на ліноліўме.

Колькі такіх партрэтаў зрабіў ён за ваенныя гады?.. Сто, дзвесце, трыста?.. Хто гэта лічыў? Хто збіраў іх?.. Хто быў упэўнены, што дажыве да перамогі?..

Першыя пасляваенныя гады. Кіеўскі мастацкі інстытут. Факультэт батальнага жывапісу. Сярод студэнтаў, сярод хлопцаў, якія хадзілі на заняткі ў салдацкіх гімнасцёрках,— Віктар Сахненка. Вучыцца, спасцігае «вышэйшую матэматыку мастацтва».

У 1961 годзе Віктар Сахненка пераязджае ў Мінск. Чалавек таварыскі і чулы, ён вельмі хутка ўвайшоў у калектыў беларускіх мастакоў. Потым ён казаў, што менавіта зычлівасць, з якой яго сустрэлі беларускія калегі, падштурхнула да стварэння карціны «Наша свята».

...У восеньскім садзе, каля стала, застаўленага дарамі беларускай зямлі, стаяць калгасніцы. Яны запрашаюць на свята ўраджаю. Жанчыны розныя па ўзросце, па характарах, аб'яднаны пачуццём гасціннасці, шчырай радасці ад сустрэчы з добрымі людзьмі. Карціна напісана ў светлых, сонечных танах, якія ствараюць настрой святочнасці.

Зусім іншая па кампазіцыі, па падыходу да тэмы, па каларыце карціна В. Сахненкі «Трактарабудаўнікі». Яна перадае дынаміку, напружаны рытм працоўнага дня. Яе кампазіцыя зладжаная і мэтанакіраваная, як зладжаная праца рабочых.

А вось палатно «Цішыня»—сама паэзія. У ім усё ўраўнаважана, усё праслкнута летуценнасцю і песеннасцю—і бэзавае святло, якім свеціцца ціхі летні надвячорак, і густы смарагд спелых траў, і празрыстае люстра возера, якое, нібы вока зямлі, задуменна глядзіць у высокае неба, і чыстае срэбра разасланых на росным лузе палотнаў.

У гэтай карціне ўражвае глыбокі роздум пра прыгажосць, пра яе месца ў жыцці чалавека, пра радасць быць блізкім да роднай зямлі, карміцца яе сокамі, разумець яе жыццё.

Гэта карціна пра любоў, дакладней, пра прадчуванне любві.

Далёка-далёка адляцелі думкі-мары дзяўчыны, якая саткала палатно і зараз вынесла яго адбельвацца на луг. Пра што яна марыць, аб чым так глыбока задумалася?.. Мастак уводзіць нас у свет песні, у свет сапраўднай паэзіі і мы яму ўдзячныя за гэта.

Душэўная прыгажосць чалавека. Чалавека складанага, шматграннага. Чалавека стваральніка і будаўніка — вось, бадай, галоўнае рэчышча, па якім развіваецца творчасць Віктара Сахненкі. Мастак пільна ўзіраецца ў свайго сучасніка, ён захапляецца ім, веліччу яго здзяйсненняў, унутранай свабодай і зычлівасцю, шчодрасцю ў адносінах да сяброў, непахіснай непрымірымасцю да ўсяго чужога, варожага.

Віктар Сахненка — жывапісец неўтаймаваны, тэмпераментны. Іншы раз, гледзячы на яго нацюрморты, партрэты, здаецца, што піша ён нават неахайна, але дастаткова прыгледзецца, і ў гэтай, на першы погляд, неахайнасці заўважыш дакладную сістэму, у якой усё падпарадкавана чоткім, выверанымі каларыстычным задачам. Віктар Сахненка любіць фарбы сакавітыя, інтэнсіўныя. Ён умее «гуляць» імі, ствараючы іншы раз на палатне зусім незвычайныя каляровыя эфекты. Гэта патрабуе ад мастака сапраўднага густу, умення «сказаць» роўна столькі, колькі патрэбна,— не болей і не меней. Я прыгадваю адзін невялічкі яго эцюд, які быў паказаны на выстаўцы твораў мастакоў, пасля вяртання іх з творчых падарожжаў. Гэты невялічкі эцюд сведчыў пра тое, што аўтар здольны вырашыць самыя складаныя каларыстычныя задачы на самым высокім узроўні майстэрства. Уявіце сабе невялічкую карцінку, якая вырашана на гульні адценняў белага колеру. Белая мазанка, белая крэмністая дарога, выбеленае гарачым паўднёвым сонцам неба, белы пыл на пажухлых ад спёкі раслінах. Якое дакладнае вока павінен мець мастак, каб, карыстаючыся, па сутнасці, толькі адной фарбай, перадаць гарачыню крымскага палудня, санлівую цішыню апусцелага пасёлка, звонкую празрыстасць паветра.

Шэраг работ Віктар Сахненка прысвяціў сваім калегам і сябрам—мастакам Беларусі. Ён напісаў партрэты Аляксандры Паслядовіч, Арлена Кашкурэвіча, Міхаіла Савіцкага.

Пра гэты, апошні партрэт, мне хацелася б пагаварыць падрабязней.

Міхаіл Андрэевіч Савіцкі—чалавек складанага, нялёгкага лёсу, выдатны мастак, сапраўдны, пранікнёны мысліцель. В. Сахненка, вырашаючы яго партрэт, адмовіўся ад усіх заманлівых аксесуараў, якія б сведчылі аб прафесіі мадэлі. Ён паогул «убраў» з палатна ўсё лішняе, усё, што перашкаджала б гледачу паглыбіцца ва ўнутраны свет партрэтуемага. Ён напісаў М. Савіцкага на глухім цемнаватым фоне, ён «зацямніў», зрабіў нейтральнымі ўсе фарбы, акрамя тых, якімі напісаны твар і рукі мастака. Твар і рукі—вось што галоўнае ў гэтым партрэце, вось што перадае характар вядомага мастака, вось на што «прымушае» нас глядзець Віктар Сахненка. Прыём гэты даволі рызыкоўны, бо дастаткова ў нечым «недацягнуць», нешта «недасказаць», і партрэта не будзе. Уся яго пабудова рухне, як картачны домік. Але Віктар Сахненка справіўся з пастаўленай задачай выдатна. Ён здолеў паказаць, што пад знешняй халаднаватасцю, «закрытасцю» вядомага мастака схавана душа сапраўднага паэта, душа чалавека, які ведае кошт пакутам, які шмат чаго зведаў і навучыўся быць добрым да людзей той дабратой, якая не даруе подласці, здрады, якая патрабуе ад чалавека гранічнай шчырасці, гранічнай прынцыповасці.

Рукі мастака, прыгожыя, з доўгімі музыканцкімі пальцамі, спакойна ляжаць на каленях. Але ў гэтым спакоі нешта нязручнае, нешта нязвыклае для героя. Паставa яго рук нечым нагадвае рукі рабочага альбо калгасніка, якія не прызвычаіліся ляжаць без работы. Гэтая дэталь гаворыць пра многае, яна падкрэслівае адну з галоўных рыс характару М. Савіцкага — працавітасць, і ў той жа час у ёй дакладны вобразны эквівалент роздуму В. Сахненкі пра працу мастака ўвогуле, пра яе складанасць, адказнасць.

Жыццё кожнага мастака цікавае тымі сустрэчамі, якія дораць яму людзі. Гэтыя сустрэчы прыносяць не толькі радасць натхнення — яны становяцца пачаткам многіх адкрыццяў, з іх складаецца, іншы раз, асабісты лёс творцы. Больш дзесяці год пражыў В. Сахненка ў Беларусі. Ён шмат ездзіў, вандраваў па нашым краі, прагна ўвабраў непаўторныя рысы, характэрныя для нашай рэспублікі, знаёміўся з цікавымі людзьмі, пісаў іх, намагаючыся пранікнуць, паглыбіцца ў характары, спасцігнуць праблемы, якімі жывуць яго героі, расказаць пра іх праўдзіва і шчыра. Лагічным вынікам гэтых пошукаў, нястомнай працы даследчыка і збіральніка стала палатно «Радня», у якім аўтар дзеліцца сваім роздумам аб духоўнай прыгажосці простых беларускіх людзей.

У садзе, каля яблыні стаіць пажылая кабета. Побач — як парасткі аднаго дрэва — дзве дзяўчыны. Светлым задорам свеціцца твар адной з іх, ціхай задуменнасцю праслкнуты пагляд другой. Мудра і проста глядзіць старая жанчына. Душэўнай шчодрасцю, здольнасцю адгукнуцца на бяду вызначаюцца твары гераінь гэтай карціны. Яны быццам увабралі ў сябе ўсё лепшае, што характэрна для беларускай жанчыны,— дабрату, вялікую ўнутраную сілу, яснасць думак, жыццялюбства.

Цяжкая памяць вайны, велічная памяць пра тых, хто змагаўся побач, хто сваім жыццём здабыў светлае свята Перамогі, заўсёды жыве ў сэрцы Віктара Сахненкі. Тэма Вялікай Айчыннай вайны, тэма неўміручага подзвігу савецкага народа — адна з галоўных тэм творчасці В. Сахненкі. Ёй ён прысвяціў цэлы шэраг карцін, сярод якіх і роздум аб нялёгкім лёсе ваеннага журналіста («Ваенны карэспандэнт»), і абагулены вобраз народа, які ўзняўся на партызанскую вайну супраць фашысцкай навалы («Наша зямля»), і ўспамін пра сваё ваеннае юнацтва («Гвардзейская прысяга»).

Тэме мужнасці і самаадданасці ў імя вялікай мэты прысвечана і палатно «Паэт Валянцін Таўлай». У гэтай карціне мастак удала расказаў пра цяжкія гады, калі камуністы Заходняй Беларусі вялі непрымірымую барацьбу супраць паноў-прыгнятальнікаў, супраць тых, хто намагаўся ператварыць братоў у ворагаў.

Падпольная друкарня. Змрочны свет каганца. Ля стала паэт. Ён глыбока задумаўся. Здаецца вось менавіта ў гэтую хвіліну нараджаюцца ў яго палымяныя радкі:

«Дык прымі ж ты лёс народу
Да смелага сэрца,
І здабудзь яму свабоду,
Не давай памерці!..»

Адна з апошніх работ В. Сахненкі — партрэт Розы Басацкай, нашай сучасніцы, чалавека новага складу, маладой дзяўчыны, якая сваёй працай славіць родную зямлю.

Радасна і ўсхвалявана глядзіць Віктар Сахненка на сваіх герояў — калгаснікаў і рабочых, воінаў і паэтаў, мастакоў і пісьменнікаў. Ён шчыра і глыбока любіць іх, захапляецца іх справамі і шчодра дзеліцца з намі ўсім гэтым.

Р. ЧАСТНОВА.

ТЫДЗЕНЬ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

ПРЫГАЖОСЦЬ СТВАРАЮЦЬ РАБОЧЫЯ

Сонца... Яркае вясновае сонца ўрываецца ў вялізныя вокны выставачнай залы Саюза мастакоў БССР. Яно асвятляе вясёлым промнем карціны, змешчаныя ў экспазіцыі выстаўкі твораў самадзейных мастакоў — супрацоўнікаў прадпрыемстваў Першамайскага раёна сталіцы.

Хаця такое яркае асвятленне тут і не пажадана, але пейзажы інжынера І. Бяляева ад гэтага нічога не страчваюць. І. Бяляеў працуе каляровымі алоўкамі, акварэллю, пастэллю. Бярозавыя гаі, яловыя лясы, залатыя палі, барвовыя закаты — вось яго улюбёныя матывы. І. Бяляеў умее «прымусіць» звычайнае гучаць па - новаму умее заўважыць у будзёным свята.

Свой, асабісты свет і ў невялікіх крыху наіўных карцінах пенсіянера П. Калеснікава, які працаваў на Мінскім гадзіннікавым заводзе. Тэмы многіх яго работ навеяны рэвалюцыйнымі падзеямі, слаўнымі подзвігамі Чырвонай Арміі. Але ён не праходзіць і міма прыгажосці прыроды. Чароўныя куткі Белавежскай пушчы, калгасныя палеткі, вулачкі старога Мінска— самадзейны мастак любіць іх, захапляецца імі і шчыра дзеліцца з намі сваімі пачуццямі.

Прыцягваюць увагу наведвальнікаў і жывапіс фрэзероўшчыка Г Бегазана, жывапіс токара Г. Счаснага, маляра Я. Лапко, разьба па дрэве П. Распутнага, малюнкі слесара С. Мацкевіча.

Слесара А. Тарасава з дзяцінства вабіў да сябе метал. Пра яго можна сказаць, што ён разумее душу метала У яго руках метал робіцца сродкам, які дапамагае самадзейнаму мастаку выказваць свае думкі, свае пачуцці. Работы А. Тарасава чаруюць рытмам ліній і аб'ёмаў. Ён прадстае перад намі то лірычным, калі «расказвае» пра закаханых, то задуменным, калі разважае пра лёс помнікаў старажытнасці, то ўзнёслым і ўрачыстым, калі стварае партрэт У. І. Леніна.

Казачныя і песенныя матывы гучаць у чаканцы і разьбе па дрэве начальніка бюро працы і заработнай платы А. Сазонава.

Іскрыцца яркімі фарбамі размаляваны ансамбль (два драўляных блюда і ваза), які зрабіў інжынер-канструктар С. Скавыш.

Сапраўдным майстэрствам вызначаецца ткацтва і вышыўкі работніцы дзіцячага сада Н. Шчэрбы і камплектоўшчыцы Л. Домаш, якія здолелі ў сваіх ручніках і посцілках захаваць і данесці да гледача прыгажосць і прывабнасць народных матываў.

На выстаўцы шмат рэльефнай разьбы па дрэве. Самадзейныя мастакі выкарыстоўваюць самыя розныя прыёмы— выпальванне з наступнай апрацоўкай дрэва каляровымі фарбамі і лакамі, разьбу па таніраваным дрэве. Ёсць на выстаўцы і работы з арганічнага шкла, «лясная скульптура», точанае дрэва.

Колькасць самадзейных мастакоў, сказаў на адкрыцці выстаўкі начальнік бюро тэхнічнай эстэтыкі аднаго з мінскіх заводаў, старшыня мастацкага савета завода Ю. Няжура, расце ад выстаўкі да выстаўкі. Гэта сведчыць пра вялікую цягу людзей да мастацтва.

Так. Выстаўка работ самадзейных мастакоў прадпрыемстваў Першамайскага раёна Мінска, яшчэ раз паказала — прыгажосць — надзённая патрэба савецкага чалавека.

Л. БРОНЬ.

«КОНЬ-АГОНЬ» і іншыя...

— Цуд? І гэта вы называеце цудам? Кіньце. Звычайная падзелка. Пучок саломы. Упэўнены, што ў сваім пакоі вы б не згадзіліся паставіць такое. Можаце мяне не пераконваць.

Мне прыгадаліся гэтыя словы скептыка, калі да століка з вырабамі мастачкі-ўмеліцы Кацярыны Гаўрылаўны Арцёменка, які мы вынеслі ў суседні, больш светлы пакой, каб было зручней фатаграфаваць, кінуліся работніцы Магілёўскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

Можа гэта і было парушэннем працоўнай дысцыпліны, але хай за гэта нам даруюць кіраўнікі фабрыкі. Мы нічога не маглі зрабіць — да стала падыходзілі ўсё новыя і новыя людзі. Нарэшце іх стала столькі, што нават фотакарэспандэнт развёў рукамі.

Фігуркі з саломы...

Якім разумным, тонкім і дакладным павінен быць позірк мастака, каб звычайная жытнёвая салома загаварыла. Загаварыла аб прыгажосці, аб замілаванасці чароўным светам народнай казкі, аб трапным народным гумары.

Кацярына Гаўрылаўна трымае ў руках сваё любімае «дзеціща» — «Конь-Агонь». Вось-вось вырвецца ён з рук, прызыўна заіржа, пасыплюцца з гарачых вачэй маланкі і панясецца, паскача конь па палях і лясах, праз вёскі і гарады.

Калі глядзіш на кампазіцыю Кацярыны Гаўрылаўны «Масленіца» міжволі прыгадваюцца пушкінскія радкі:

Какой избыток чувств и сил,
Какое буйство молодое!

Тройка. Імклівая. Трапяткая. Здаецца імчаць лёгкія санкі па іскрыстым снезе скрозь гаманлівы, вясёлы натоўп. Заліваецца ў руках старога гармонік са званочкамі. Шчодра частуе гасцей гарачымі пульхнымі блінамі бабка, а хлопцы-зух вялізнай лыжкай лье на бліны алей... У хлопца хітрынкі ў вачах. Пра такіх кажуць, што ён па слова ў кішэню не палезе. Здаецца, ён так і сыпле прымаўкамі, прыслоўямі, частушкамі.

На розных мовах пісаліся словы захаплення пра «Масленіцу». Яна пабывала на выстаўках у Манрэалі, Асака, Сафіі, Хельсінкі, Загрэбе.

А вось новая кампазіцыя — «Лявоніха на арбіце». Колькі трапнага сакавітага гумару ў постаці недарэкі-Лявона. На галаве ў яго хустка, адна нага абута ў бот, другая — у галёшу (няма ж часу дагледзець сябе з-за хатніх клопатаў). Паверх пінжака Лявон нацягнуў жаночы фартух, у руках міска з крупамі для курэй. Ды і куры тутака. Квохчуць, махаюць крыллем, ляцяць на нікчэмнага гаспадара.

А Лявоніха горда шыбуе на рыбалку. На плячы вуда. Твар — нібы пакуты Лявона яе і не датычаць. Тут жа на пянёчку сядзіць гарманіст. Іграе нешта такое вясёлае, што аж сам смяецца — рот да вушэй.

К. Г. Арцёменка — першая злева.

Зіхацяць каралі на маляўнічых сарафанах дзяўчат, палымнеюць кашулі хлопцаў — яшчэ «адзін твор» Кацярыны Арцёменка — «Карагод». Дзівоснае свята пластыкі і рытму, нібы прасякнутае мілагучнай песеннай мелодыяй.

Народная мудрасць сведчыць — лепей раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Аспрэчваць гэтую ісціну не мае сэнсу. Сапраўды, захапленне ад работ Кацярыны Гаўрылаўны нельга перадаць словамі. Іх трэба бачыць. Бачыць дзівосных «Янку», «Маладзіцу», кампазіцыю «Хлеб-соль Магілёўшчыны» і многія, многія іншыя работы гэтай сапраўднай чараўніцы.

Расказваюць, што ў Манрэалі, дзе экспанаваліся вырабы мастачкі, людзі, якія пакінулі радзіму яшчэ да рэвалюцыі ў пошуках кавалка хлеба і лепшай долі, цалавалі край абруса, на якім стаялі дзівосныя вырабы простай беларускай жанчыны, сапраўднай мастачкі Кацярыны Арцёменка.

У Сафію Кацярына Гаўрылаўна вазіла сваіх саламяных «сяброў» сама. Яна шчыра дзялілася сакрэтамі свайго майстэрства з балгарскімі калегамі. Дзесяткі сувеніраў, якія яна зрабіла тут жа ў залах выстаўкі, куплялі наперабой.

У адрас Магілёўскай фабрыкі мастацкіх вырабаў, на якой працуе Кацярына Арцёменка, прыходзіць шмат пісьмаў са штэмпелямі самых розных гарадоў нашай краіны.

Просьба ў іх адна:

— Дашліце, калі ласка, вырабы мастака Арцёменка.

Валодае Кацярына Гаўрылаўна той своеасаблівай здольнасцю, пра якую ў свой час пісаў Вісарыён Бялінскі: «Мысліць і адчуваць асаблівым чынам, бачыць шмат там, дзе іншыя нічога не бачаць», здольнасцю, якая ператварае звычайнага чалавека ў мастака. У сапраўнага мастака.

Дачка паравознага машыніста, салдата Вялікай Айчыннай, які не вярнуўся з вайны, яна раздзяліла лёс свайго пакалення. У семнаццаць гадоў стала сандружынніцай.

Пасля вайны працавала Кацярына Гаўрылаўна на сціплай пасадзе машыністкі. Машыністкай уладкавалася і на Магілёўскую фабрыку мастацкіх вырабаў. У вольны час яна любіла рабіць кветкі. З яе рук яны выходзілі нібы жывыя. І калі рыхтаваліся да святочных дэманстрацый, кветкі, якімі ўпрыгожвалі калону фабрыкі, рабіла Кацярына Арцёменка.

Дырэктар фабрыкі Аляксандра Цімафееўна Зінкевіч не раз гаварыла:

— Не сваёй справай займаешся... Тваімі пальцамі не на машынцы грукаць...

Аднойчы яна прывяла ў свой кабінет старога з пукам саломы...

У той дзень сядзелі яны ўтрох дацямна. І назаўтра таксама. І праз дзень доўга гарэла святло ў кабінеце дырэктара.

Праз тыдзень Кацюша заплакала:

— Не магу болей... Няздольная я...

Але Аляксандра Цімафееўна не адступала. І не памылілася.

Яны і цяпер ляжаць на стале дырэктара, тыя нязграбныя пляцёнкі. А мастак-умеліца Кацярына Гаўрылаўна Арцёменка, якая сама ўжо дала пуцёўку ў мастацтва васьмідзесяці вучням, не-не ды і ўсміхнецца, прыгадваючы, як калісьці з зайздрасцю назірала за спрытнымі пальцамі дзядулі-майстра.

...Стаіць у мяне на кніжнай паліцы саламяная матрошка. Сінявокая. Шчаслівая. Дарагі для мяне сувенір. І хто б ні зайшоў у пакой, адразу звяртае на яе увагу:

— Які цуд! Дзе вы пабылі яе?!..

Н. КАТЛЯРОВА.

Свята мастацтва адкрыў БЕЛАЗ...

Па даўняй традыцыі адкрыццё Тыдня выяўленчага мастацтва адбылося ў Жодзіна.

У гэтыя дні ў гарадскім доме культуры і ў памяшканні Жодзінскага філіяла політэхнічнага інстытута будуць працаваць дзве выстаўкі — вялікая выстаўка твораў жывапісу і графікі з фондаў Мастацкага фонду БССР і выстаўка работ мастакоў, якія жывуць і працуюць у Жодзіна.

16 красавіка, ва ўрачыстай абстаноўцы ў Жодзінскім доме культуры старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. Пратасеня абвясціў пачатак тыдня.

На здымках, якія зрабіў у гэты дзень у Жодзіна наш фотакарэспандэнт У. Крук, — В. Пратасеня і Л. Гумілеўскі сярод аматараў выяўленчага мастацтва, жыхары Жодзіна ў залах выставак.

«ТЫДЗЕНЬ» КРОЧЫЦЬ ПА РЭСПУБЛІЦЫ

БРЭСТ

Адбылося абмеркаванне III Усесаюзнай выстаўкі акварэлей, якая працавала ў Брэсце і Пінску. На абмеркаванне выстаўкі прыехалі госці з Масквы А. Барбарыўш, Таліна — В. Лемберг-Багаткіна, Керчы — Я. Карцыганаў, загадчык сектара маскоўскіх выставак Саюза мастакоў СССР Н. Пракоф'ева.

На дывановым камбінаце адкрылася выстаўка твораў жывапісу, графікі і дэкаратыўна прыкладнога мастацтва мастакоў Брэстчыны. У выстаўцы прынялі ўдзел П. Данелія, Э. Куфко, В. Сабалеўскі, М. Клімаў, У. Нікалаеў.

НЯСВІЖ

Адкрылася выстаўка жывапісу і графікі мастака Ю. Пучынскага.

ЧЭРВЕНЬ

У сярэдняй школе № 1 разгорнута экспазіцыя часопіснай графікі. Вучні і жыхары Чэрвеня пазнаёмяцца з ілюстрацыямі І. Давідовіча, У. Пашчасцева, І. Немагая, Я. Куліка, А. Лось, якія былі надрукаваны ў беларускіх часопісах.

МІНСК

Студэнты філалагічнага факультэта БДУ імя Леніна сустрэліся з вядомымі беларускімі мастакамі Я. Зайцавым, Р. Кудрэвіч, С. Герусам, якія расказалі аб сваёй рабоце, падзяліліся творчымі планамі.

ВІЦЕБСК

Больш сарака скульптур і жывапісных палотнаў прадстаўлена на выстаўцы твораў Д. Генеральніцкага. У апошнія гады свайго жыцця мастак працаваў над серыяй партрэтаў герояў-партызан Віцебшчыны. З гэтых работ на выстаўцы паказаны партрэты Героя Савецкага Саюза М. Сільніцкага, У. Свідзінскага, праект помніка легендарнаму бацьку Мінаю.

ГОМЕЛЬ

Каля ста работ паказалі на групавой выстаўцы мастакі «Гомельгандльрэкламы». Яны «выступілі» амаль ва ўсіх жанрах выяўленчага мастацтва — жывапісе, графіцы, скульптуры, кераміцы, чаканцы.

Сярод удзельнікаў выстаўкі А. Дабравольскі, І. Мялейша, Л. Антоненка, В. Кавалёў, Г. Соркіна, А. Белянына.

САЛІГОРСК

З шахцёрамі і жыхарамі горада-гарняка сустрэўся Г. Паплаўскі. Ён правёў наведвальнікаў па выстаўцы сваіх работ з творчага падарожжа па Індыі, расказаў аб паездцы, аб старажытным і цудоўным мастацтве Індыі.

НАРОДНЫ ТЭАТР І ЯГО ПРАБЛЕМЫ

У рэспубліцы працуюць 49 народных тэатраў. Якім сёння павінен быць гэты творчы калектыў, у чым яго патрэбы, як арганізавана ў ім творчае жыццё, што сабою ўяўляе рэжысура народнага тэатра, яго сувязі з гледачом? Гэтыя і іншыя пытанні сёння ставяцца на парадак дня. Артыкулам А. Бяляева — рэжысёра народнага тэатра палаца культуры Мінскага трактарнага завода, заслужанага работніка культуры БССР мы пачынаем абмеркаванне надзённых праблем жыцця і працы народных тэатраў. Запрашаем рэжысёраў, акцёраў, мастакоў народных тэатраў, шматлікіх гледачоў, работнікаў прафесійных тэатраў, чытачоў нашай газеты прыняць удзел у гэтай гаворцы.

МІНУЛА трынаццаць гадоў, як у нашай краіне створаны народныя тэатры. Яны з'яўляюцца актыўнымі памочнікамі партыі ў камуністычным выхаванні народа, у прапагандзе лепшых твораў савецкай драматургіі і класікі.

Пра гэта сведчыць рэпертуар народных калектываў, які вызначаецца сваёй мэтанакіраванасцю, баявітасцю і надзённасцю. Нагадаю толькі некаторыя назвы п'ес, якія ставяць народныя тэатры нашай рэспублікі: «Паэма пра сякеру» М. Пагодзіна, «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава, «Сям'я» І. Папова, «Вечна жывыя» В. Розава, «Разлом» Б. Лаўрэнёва, «Вогненны мост» Б. Рамашова, «Салаўіная ноч» В. Яжова, «... А зоры тут ціхія» Б. Васільева, «Твой дзядзя Міша» Г. Мдзівані, «Іголка і штык» А. Галіева. Багатая афіша нацыянальнай драматургіі: купалаўская «Паўлінка», «Вайна вайне» Я. Коласа, «З народам» К. Крапівы, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Сэрца на далоні» і «Крыніцы» І. Шамякіна, «Трыбунал» А. Макаёнка, «Амністыя» М. Матукоўскага, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «Ганка» У. Галубка, «Адкуль грэх?» А. Петрашкевіча. Мы ставім на сваёй сцэне драматургію Л. Талстога, А. Астроўскага, А. Чэхава, М. Горкага, Мальера, Б. Шоў...

Радавацца гэтай разнастайнасці ці не? З аднаго боку прыемна, што народныя тэатры рэспублікі так вырасліі, што мы цяпер можам ставіць вялікія шматактовыя спектаклі. Нас прызнаў глядач і ахвотна наведвае нашы спектаклі. А гэта вельмі прыемна.

З другога боку задумваешся: ці ўсе нашы работы знаходзяцца на ўзроўні сучасных патрабаванняў да тэатра народнага? І калі прааналізуеш зробленае, то міжвольна прыходзіш да думкі, што многія спектаклі павінны быць больш дасканалымі, выразнымі і яснымі. Пра гэта даводзіцца гаварыць з болем у сэрцы.

Бяда тут, як мне здаецца, не толькі адных кіраўнікоў тэатраў, якія ўключаюць у свой рэпертуар тую ці іншую п'есу, часам не маючы выканаўцаў нават на галоўныя ролі. Вымушаны яны гэта рабіць у пагоні за тэмай, якая адпавядала б умовам таго ці іншага конкурсу. Бяду іншы раз нясуць і тыя рэкамендацыйныя спісы рэпертуару, якія нам дасылаюць дамы народнай творчасці. Спісы гэтыя складаюцца, як правіла, без уліку творчых магчымасцей таго ці іншага калектыву і без удзелу рэжысёраў вядучых тэатраў рэспублікі. Калі трымацца падобнага прынцыпу, то работа гэтая не складаная: уключыў у рэпертуарны спіс творы найбольш папулярных драматургаў, якія ставяць прафесійныя тэатры, падпісаў яго і з плеч далоў.

Толькі фармалізм у гэтай важнай справе нецярпімы. Многія народныя тэатры творча пасталелі і, відаць, не грэх будзе даць такім калектывам магчымасць самім вызначаць рэпертуарную лінію, зыходзячы са сваіх індывідуальных творчых магчымасцей.

Гаворачы пра гэта, я ні ў якім разе не сцвярджаю, што фарміраванне рэпертуару трэба пусціць на самацёк. Не, патрэбны кантроль і праверка, своечасовая дасведчаная дапамога і парада. Але ўсё ж такі ніхто не ведае свайго калектыву лепш, чым яго кіраўнік: радасці і поспехі, засмучэнні і няўдачы, творчае амплуа акцёра, яго настрой, гатоўнасць выконваць тую ці іншую ролю. І не ўлічваць гэтага, вядома, нельга.

Патрабаванні да народных тэатраў высокія. Але на нашым шляху нямала цяжкасцей. Калі, скажам, у прафесійным тэатры на 40—50 акцёраў з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй штаты дасягаюць ста і больш чалавек, то ў народным тэатры на 50—60 акцёраў-аматараў маецца адзін рэжысёр і загадчык пастановачнай часткі. А трэба ж весці творчую і выхаваўчую работу ў калектыве. Мне здаецца, што час ужо перагледзець штаты народных тэатраў. Надзвычай патрэбны нам педагогі, якія б вялі заняткі па акцёрскаму майстэрству, сцэнічнай мове і руху, гісторыі тэатра і інш.

Будучыня тэатра — у яго акцёрскай змене. У нашым калектыве даўно працуе студыя. Ужо адбылося шэсць яе выпускаў. Новы набор мы праводзілі па конкурсу. Нам нават могуць пазайздросціць некаторыя вышэйшыя навучальныя ўстановы: на адно месца было 25 абітурыентаў. Зараз у студыі займаецца 28 чалавек. Заняткі адбываюцца чатыры разы на тыдзень. Чытаецца поўны курс гісторыі беларускага тэатра, выкладаецца сцэнічная мова і рух, акцёрскае майстэрства. Студыйцы ўдзельнічаюць у невялічкіх эпізодах і масавых сцэнах у спектаклях, што ставіць тэатр.

Апошняя работа студыйцаў — масавыя сцэны ў спектаклі «Вайна вайне» Я. Коласа,—шчыра кажучы, парадавала. І нашы дэбютанты Ала Хадатовіч і Мікалай Сыман паказалі сябе ў гэтым спектаклі здольнымі акцёрамі. Былы наш выхаванец Генадзь Куцькін зараз старшыня мастацкага савета тэатра, адзін з вядучых акцёраў калектыву.

Калі ўжо зайшла гаворка пра акцёраў тэатра, то нельга не прыгадаць дынастыю Крамарэнкаў — Вольгу Гаўрылаўну, работніцу кавальскага корпуса завода, яе сына — слесара ліцейнага цэха Паўла Крамарэнку і яго жонку Тамару Крамарэнка. Усе трое ўдзельнічаюць у спектаклі «Вайна вайне» і радуюць гледачоў сваімі творчымі знаходкамі.

Мне могуць сказаць: добра вам, трактаразаводцам, вы і студыю маеце, і кваліфікаваных педагагоў запрашаеце. Нічога дзіўнага няма — сталіца! Сапраўды, нам, відаць, гэтую справу арганізаваць крыху лягчэй, хаця і ў нас ёсць нямала цяжкасцей. А як быць, скажам, народным тэатрам, якія знаходзяцца ў Целяханах, Краснаполлі, Багушэўску, Цімкавічах, Браславе? Паблізу ж няма тэатраў, няма спецыялістаў, а вучыцца ўсё роўна трэба.

Тут, на маю думку, неабходна шырэй прапагандаваць завочнае навучанне ў інстытутах культуры. Варта таксама арганізаваць вочна-завочнае навучанне на рэспубліканскіх курсах. На дапамогу павінна прыйсці і Беларускае тэатральнае аб'яднанне — наладзіць чытанне курса лекцый, розныя кансультацыі і г. д.

Ёсць яшчэ многа іншых нявырашаных праблем, якія хвалююць нас, рэжысёраў. Палажэнне аб народным тэатры прадугледжвае, напрыклад, выпускаць у год не менш двух шматактовых спектакляў і столькі ж аднаактовых. Гэта многа, калі ўлічыць колькі арганізацыйных намаганняў, акрамя творчых, даводзіцца прыкладаць пры нараджэнні кожнай прэм'еры.

Працягласць жыцця новага спектакля, як правіла, не перавышае 10—15 паказаў. Недаравальнае марнатраўства! А тлумачыцца гэта тым, што выезды народнага тэатра не плануюцца ні дамамі творчасці, ні ведамаснымі арганізацыямі, якім падпарадкаваны тэатры. Усё залежыць ад увішнасці, спрыту, ініцыятывы рэжысёра і саміх удзельнікаў тэатра. Здолеюць яны арганізаваць гэтую справу — добра, не здолеюць—спектакль аджыве. А ён толькі-толькі «абкатаны», яму б яшчэ жыць ды жыць... Так скасоўваецца праца цэлага калектыву.

Прывяду прыклад кароткага жыцця спектакля ў нашым тэатры «Год 1917» П. Васілеўскага. Гэты спектакль быў удастоены дыплома першай ступені і пераходнага прыза тэатра імя Янкі Купалы. Паказвалі ж мы яго ўсяго толькі 16 разоў. За другую нашу работу — «Дзевятую сімфонію» Ю. Прынцава—калектыву было прысвоена званне лаўрэата ўсесаюзнага конкурсу. І гэты спектакль ставіўся 17 разоў. Падобных прыкладаў можна нагадаць нямала.

Дрэнна і тое, што у плане работы палаца культуры трактарнага завода не значацца спектаклі народнага тэатра. Мы, напрыклад, не ведаем, колькі спектакляў і калі (у якія дні) будзем паказваць у маі—чэрвені і г. д.

Лепш у нас вырашаецца планаванне гастроляў. Два разы ў год — зімой і летам тэатр выязджае ў раёны рэспублікі. Гэтая традыцыя ў нас ужо вядзецца на працягу дзесяці гадоў. Летась калектыў абслугоўваў камсамольскія будоўлі рэспублікі. Мы выступалі ў Лельчыцкім, Калінкавіцкім, Мазырскім і іншых раёнах поўдня Беларусі. Зімою былі ў Гродна і Лідзе. Ну, а ў ліпені сёлета паедзем абслугоўваць працаўнікоў вёскі Лепельскага і Навагрудскага раёнаў. Штогод калектыў наладжвае 160—170 спектакляў і канцэртаў.

У розных кутках рэспублікі працуюць народныя тэатры. Жывуць і дзейнічаюць яны ізалявана адзін ад другога. Творчых зносін паміж імі фактычна няма. Дзеля карысці справы трэба глядзець спектаклі іншых народных тэатраў, бываць адзін у аднаго, сустракацца. Як хораша было б, каб можна было рэжысёру паставіць спектакль у свайго суседа.

З ГЛЫБІНЬ ЖЫЦЦЯ

70 год з дня нараджэння Платона ГАЛАВАЧА.

НЕПРАЦЯГЛЫМ быў творчы шлях Платона Галавача. Крышачку больш за дзесяць гадоў. Але ў беларускай прозе ён пакінуў прыкметны след. Лёс беларускага сялянства, сацыялістычная перабудова вёскі, нараджэнне новага чалавека, барацьба за ўмацаванне Савецкай улады знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творчасці пісьменніка, які адлюстраваў у сваіх кнігах бурныя падзеі часу. Яму, выхадцу з бядняцкай сям'і, добра былі вядомы пакуты і гора беларускага сялянства. Яго лёс зрабіўся для пісьменніка асабістай тэмай, якая кранала да глыбіні сэрца.

П. Галавач нарадзіўся 18 красавіка 1903 года ў вёсцы Пабокавічы Гарбацэвіцкай воласці, што была тады на Бабруйшчыне. З дзіцячых гадоў пазнаў усю цяжкасць жыцця. З горыччу ўспамінаў ён пазней: «Маткі не памятаю: яна памерла, калі я быў зусім малы. У сямігадовым узросце паспытаў уласнага хлеба, прыйшлося ісці пастухом. Вучыцца па-сапраўднаму не было магчымасці, і ўсе мае агульнаадукацыйныя «універсітэты» — Гарбацэвіцкая царкоўнапрыходская школа».

Пасля рэвалюцыі П. Галавач стаў першым камсамольцам у роднай вёсцы, узначаліў створаную ім ячэйку.

Неўзабаве ў друку з'яўляюцца яго карэспандэнцыі, нататкі, невялікія нарысы — на старонках бабруйскага «Камуніста», а потым у рэспубліканскім друку. Бабруйскі павятовы камітэт камсамола па прапанове Веры Харужай накіроўвае П. Галавача на вучобу ў Мінск, у Камуністычны універсітэт імя У. І. Леніна. Тут ён уступае ў партыю.

У 1925 годзе ў друку з'яўляецца апавяданне П. Галавача «Загубленае жыццё». Яно было заўважана крытыкай і чытачамі. З таго часу і пачынаецца літаратурная дзейнасць пісьменніка.

Пісьменнік адлюстроўвае быт старой вёскі («Рубанаўскі вузел», «Кнак», «Яўленая» і інш.), гаворыць аб неабходнасці яе перабудовы У 1927 годзе выходзіць першая кніжка пісьменніка «Дробязі жыцця». Апавяданні наступнага зборніка «Хочацца жыць» выразна малююць карціны класавай барацьбы на сяле.

Аповесць «Спалох на загонах» пісалася ў гарачы час калектывізацыі. «Я разумеў, што ў вёсцы, у масе сялянства адбываецца рашучы пералом, рашучы паварот у бок да сацыялізму, і разумеў, што пісьменнік-камуніст не можа не быць жывым сведкам і ўдзельнікам гэтых падзей» — адзначаў П. Галавач.

Пазней у артыкуле «Як была напісана аповесць «Спалох на загонах» П. Галавач падкрэсліў, што ён пісаў аповесць, каб дапамагчы партыі ў справе калектывізацыі. Аўтар, па яго ўласнаму вызначэнню, хацеў «праўдзіва, без прыфарбоўкі паказаць селяніну ў мастацкім творы ўсё тое, што адбываецца вакол яго, але паказаць так, каб ён убачыў усё гэта, ужо бачанае, па-новаму». Нягледзячы на асобныя недахопы аповесці, пісьменнік дасягнуў сваёй мэты. Яму ўдалося паказаць працэс калектывізацыі вёскі «з усімі цяжкасцямі, з усёй складанасцю класавага змагання».

Побач з літаратурнай дзейнасцю П. Галавач вядзе вялікую грамадскую работу. Доўгі час ён працуе ў камсамоле, выбіраецца першым сакратаром ЦК ЛКСМБ і адначасова адказным рэдактарам газеты «Чырвоная змена». У 1929 годзе становіцца намеснікам наркома асветы.

Вялікі ўплыў на развіццё творчасці П. Галавача аказала асабістае знаёмства і сустрэчы з М. Горкім. Высока цаніў беларускі празаік дружбу з Ул. Лідзіным, добра ведаў А. Серафімовіча, Ф. Гладкова. Ус. Іванава. Яму пашчасціла сустракацца з Р. Раланам, І. Бехерам, А. Зэгерс. П. Галавач прызнаваўся, што «вучыўся пісаць па ўсім лепшым». Ён многа зрабіў для наладжвання трывалых сувязей беларускіх пісьменнікаў з рускімі і ўкраінскімі літаратарамі.

У сярэдзіне 30-х гадоў П. Галавач закончыў работу над раманам «Праз гады», самым буйным сваім творам, які ўвабраў у сябе жыццёвыя назіранні і развагі пісьменніка пра свой час, пра ролю Камуністычнай партыі ў перабудове жыцця, пра шляхі сялянства і інтэлігенцыі ў рэвалюцыі і ў пабудове сацыялізму. Галоўным жа героем твора стала беларускае сялянства, доля якога прасочваецца з сапраўднай філасофскай глыбінёй. Раман з'явіўся значнай падзеяй у беларускай літаратуры, сведчыў аб росце таленту пісьменніка.

У апошнія гады жыцця П. Галавач напісаў аповесці «Носьбіты нянавісці» і «Яны не пройдуць!», якія прысвяцілі падзеям грамадзянскай вайны на Беларусі. У гэтых творах пісьменнік сцвярджаў непераможнасць народных мас, якія ўзняліся на абарону сваёй роднай Савецкай улады.

П. Галавач радаваўся працэсу абнаўлення краіны і людзей, які праходзіў пад кіраўніцтвам ленінскай партыі. На яго вачах адыходзілі ў мінулае, знікалі назаўсёды голад, жабрацтва, беспрацоўе. Непазнавальна змянілася родная Беларусь. Адданы сын свайго народа, пісьменнік быў заўсёды з тымі, хто будаваў «свет сонечнай праўды, свет сацыялізму». Ён ганарыўся, што быў сучаснікам вялікіх падзей. Савецкі Саюз ён называў «краінай гігантаў мыслі і камуністычных спраў, радзімай новага чалавецтва».

Цімох ЛІЯКУМОВІЧ.
Бабруйск.

Народны тэатр трактарнага шэфствуе над цэхавай самадзейнасцю. Вельмі часта ў абедзенны перапынак нашы артысты выступаюць з канцэртамі. У нас ёсць свае чытальнікі, спевакі, танцоры, мы паказваем урыўкі з спектакляў і невялічкія інтэрмедыі.

Трактарны завод шэфствуе над калгасамі і саўгасамі Лагойскага раёна. Не засталося ўжо ніводнай гаспадаркі ў гэтым раёне, дзе тэатр не паказаў бы свайго спектакля. Нас ведаюць працаўнікі палёў і заўсёды гасцінна сустракаюць. У калгасе «Крайскі» арганізавалі драматычны гурток, які паставіў два аднаактовыя спектаклі. На жаль, нам не ўдалося дамагчыся таго, каб сельскі гурток працаваў сістэматычна.

За ўзорнае абслугоўванне працаўнікоў вёскі народнаму тэатру трактарнага завода летась быў прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства культуры СССР і ВЦСПС.

Няма падстаў скардзіцца на няўвагу трактаразаводцаў да свайго тэатра. На нашых прэм'ерах, на пасяджэннях мастацкага савета прысутнічаюць сакратар парткома завода К. Каратай, яго намеснік Т. Кішчанка, старшыня заўкома Ф. Чухнакоў. А нядаўна на прэзідыуме заўкома абмяркоўвалася работа народнага тэатра і яго мастацкага савета. І ўсё ж ёсць пытанні, якія трэба яшчэ вырашаць. Мінула ўжо амаль чатыры месяцы гэтага года, а каштарыс тэатра на 1973 г. не зацверджаны. Гэтым і тлумачыцца, што мы затрымалі здачу спектакля «Не так жыві, як хочацца» А. Астроўскага.

Моцна перашкаджае нам у рабоце і тое, што артысты тэатра працуюць у розныя змены і ў адпачынак яны ідуць не адначасова, а па графіках сваіх вытворчых цэхаў і аддзелаў. Неаднаразова гэтыя пытанні ставіліся перад адміністрацыяй завода, парткомам і заўкомам. Усе пагаджаюцца з тым, што сапраўды трэба пайсці насустрач калектыву, але справу зрушыць з месца і па сённяшні дзень не ўдаецца, хаця асноўны склад тэатра налічвае да 30 чалавек. Для такога гіганта, як наш завод, гэта — кропля ў моры.

У гэтым артыкуле я спыніўся толькі на некаторых пытаннях жыцця і вопыту народнага тэатра. Спадзяюся, што мяне дапоўняць мае калегі-рэжысёры, артысты, усе шматлікія прыхільнікі народнага мастацтва.

Аляксей БЯЛЯЕЎ.

Студэнтка 2-га курса Галіна Такмінінава.

Міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч уручае Ганаровую грамату старэйшаму выкладчыку Л. С. Мухарынскай.

СОРАК ПЕРШАЯ МУЗЫЧНАЯ ВЯСНА...

Звыш сарака гадоў прайшло з таго дня, калі ў невялічкім будынку на ціхай вуліцы імя Кірава адкрылася першая ў гісторыі беларускага народа вышэйшая музычная навучальная ўстанова. З удзячнасцю ўспамінае грамадскасць тых дзеячоў, якія пачалі рыхтаваць у нашай рэспубліцы кадры музыкантаў вышэйшай кваліфікацыі па розных спецыяльнасцях.

Прафесарам М. Аладаву, А. Бяссмертнаму, В. Залатарову, Я. Зільбербергу, Г. Папавіцкаму, П. Ціхановічу і іншым мы абавязаны тым, што яны яшчэ ў даваенны час выхавалі кампазітараў, спевакоў, піяністаў, выканаўцаў на народных інструментах, хормайстраў, якімі мы па праву ганарымся сёння.

Нядаўна Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А. Луначарскага адзначыла знамянальную дату — саракагоддзе.

Спявае былы выхаванец Валерый Кучынскі.

Гэтыя здымкі зроблены ў час святкавання саракагоддзя Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

Выступае сімфанічны аркестр.

Фота Ул. КРУКА.

СЯМ'Я АРХІТЭКТАРАЎ

ісці гуляць ці не ісці, што купіць на вячэру... Таму і нерваваўся цяпер, што жонка паводзіла сябе так, быццам ёй абыякава яго праца.

Поля разумела гэта. Але што яму параіць? Усё жыццё яна старалася адно — памагчы яму ў творчасці ўсім, чым толькі можна, і заўсёды баялася зноў-такі аднаго — перашкодзіць яму. Безумоўна, яна больш практычная пры рашэнні любой бытавой, сямейнай задачы. Але ніколі яна не ўлазіла ў архітэктуру — накшталт Дашы Карначовай і другіх архітэктаравых жонак, якія з выглядамі глыбокіх знаўцаў разважалі пра дойлідства з такой жа лёгкасцю, як пра панчохі і бюстгальтары. Смешна слухаць бывае...

Поля выцерла рукі і села на табурэтку каля дзвярэй, па-сялянску, — на самы край, сашчапіла на жываце, на запырсканым фартусе рукі.

Віктар наблізіўся да яе, скрывіўся, як ад болю, сказаў амаль шэптам, паказваючы на дзверы:

— Пацягнула мяне за язык... Але што я мог адказаць, калі ён, парася, папракаў, чаму я ўсё жыццё сяджу на жыллі? Балбатун. Але не ў час усё гэта. «Я збудую раён, пра які табе захочацца напісаць манаграфію». А заўтра ён даведаецца...

Полю гэта не засмуціла, наадварот, узрадавала: бацьку так важна, што падумаюць пра яго дзеці! Хіба не радасна гэта для маці?

Але яна зноў змаўчала.

Віктар падышоў да акна, паглядзеў на вуліцу, на дом насупраць, дарэчы — яго дом, які заўсёды мазоліў яму вочы, бо гэта быў адзін з тых дамоў, якія лепш не ўспамінаць. Мала суцяшала, што знешні выгляд дома сапсавалі будаўнікі, іх віна большая. Максіму ніхто палац не сапсаваў: ён біўся за кожны пілястр, за кожную плітку...

Выходзіць, Поля ўхваляе яго намер. Так проста? Так лёгка? Шугачоў адчуў расчараванне. Не разумее, значыцца, чым гэта можа скончыцца. Сказаў ад акна, — знарок гучна — няхай чуюць дзеці:

— Мяне палохае не тое, што з маёй адмовы могуць зрабіць, ведаеш, якія вывады... Я сам зрабіў бы. Кіраўнік майстэрні адмаўляецца ад задання. Які ж ты кіраўнік? Злазь з месца. Не падводзь інстытут. Калі хочаш, могуць запісаць нават у картачку — трыццаць гадоў чыстая... Калі мне пасля гэтага дадуць галоўнага архітэктара праекта? Шукаць пад старасць шчасця ў другой рэспубліцы? — ён знарок сказаў пра тое, супраць чаго, не сумняваўся. Поля запярэчыць самым рашучым чынам. Дзіўна, што і тут яна змаўчала. Гэта адарвала Віктара ад акна, прымусіла зірнуць жонцы ў вочы. Незразумела яна сябе паводзіць сёння. Вочы ў яе сталі сумныя і твар, здалося, пабялеў. Зрабілася шкада яе і ён суцешыў: — Нікуды я не паеду. Я беларус. Да гэтага горада прывязаны пупавінай. І мне нічога не страшна! Я магу працаваць радавым праекціроўшчыкам. Нам будзе нялёгка. Але я ведаю: ты не ўпікнеш мяне. Не?

Поля маўчала. Гэта ўжо зусім было дзіўна і незразумела, яшчэ больш устрывожыла.

Віктар глядзеў на жонку ва ўпор, чакаючы, што яна, як заўжды, скажа, параіць нешта такое, ад чаго ўся яго праблема зробіцца простай і яснай. Як з Верай. Яму здалося трагедыяй, а Поля вырашыла так мудра і проста.

Нарэшце яна спытала:

— Ты з Максімам раіўся?

Ён чамусьці ўзлаваўся.

— Не хачу я з ім і раіцца! Ён запэўніў яшчэ год назад, што яны з Ігнатовічам дамогуцца дазволу на эксперыментальны раён. Я спадзяваўся на іх. На каго больш можна спадзявацца? А цяпер у іх разлад. Ідыёт. З-за дурной бабы ён загубіў такую справу!

— Не лай яго, Віця. Яму нялёгка.

— А мне лёгка?

Яна сказала на дзіва проста і ўпэўнена:

— Віця, ты спраектуеш Зарэчны раён.

— Так ты мяне зразумела і падтрымала? Дзякую!

— Цябе замучыць сумленне, калі ты адмовішся.

Ён закрычаў на ўсю кватэру:

— Сумленне! З-за гэтага праклятага сумлення я загубіў свой талент!

— Не крычы, Віця. Дзеці. Ты і па гэтых нарматывах зробіш не горш. Я ж ведаю цябе лепш, чым хто.

Ён раптам абмяк, знясілена апусціўся на табурэтку. Ён капітуляваў перад мяккай, але непахіснай сілай жаночай логікі.

Цяпер трэба натхняцца на іншае — па працу. Знясілены душэўнай барацьбой, ён у глыбіні душы радаваўся такому Полінаму рашэнню. Ён не зманіў дзецям. Сказаў ім праўду! Зарэчны раён будзе. Яго, Шугачоўскі!

ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ У МАСКВЕ

У лёгкіх сукенках, адстрочаных беларускім арнаментам, плылі па велізарнай сцэне Крамлёўскага палаца з'ездаў нашы балерыны. І здавалася, што гэта цякуць, пераліваючыся і зззяючы на сонцы, спакойныя воды беларускіх рэк. Так запомніўся масквічам і гасцям сталіцы, якія прысутнічалі на юбілейным канцэрце ў гонар 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР, каргод «Рэчанька», выкананы артыстамі тэатра оперы і балета БССР. Поспех быў велізарны.

Неўзабаве ўдзельнікі гэтага канцэрта зноў з'явяцца перад сталічнымі гледачамі. Балетная трупа запрошана на гастролі ў Маскву. Выступленні будуць праходзіць на сцэне Крамлёўскага палаца з'ездаў з 20 мая па 9 чэрвеня. На працягу 16 вечароў беларускія артысты пакажуць 4 лепшыя свае спектаклі.

Творчая справаздача ў сталіцы Радзімы адкрыецца адной з апошніх работ тэатра — «Раймондай» Аляксандра Глазунова. Гэту жамчужыну рускай музыкі і харэаграфіі нанава адрэдагаваў і паставіў галоўны балетмайстар тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Л. Андрэеў. У гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА ён сказаў:

— Гастролі ў Маскве заўсёды вельмі адказныя. Але сёлетнія—адказныя ўдвая. Якраз да гэтага часу ў сталіцу нашай радзімы з'едуцца вядомыя дзеячы мастацтваў многіх краін на XV кангрэс міжнароднага інстытута тэатра і міжнародны конкурс артыстаў балета. Такое «суседства» прымушае нас рыхтавацца да паездкі яшчэ больш старанна. Усе без выключэння танцоры разумеюць велізарную меру адказнасці, працуюць з небывалым уздымам.

У нас склаўся добры ансамбль. Яго вызначае высокая творчая дысцыпліна і працавітасць. Мы пастараемся зрабіць усё, каб дастойна прадставіць беларускі балет масквічам і савецкі балет—зарубежным калегам.

Цяпер аб рэпертуары і вядучых выканаўцах. У першы вечар мы «дадзім слова» моладзі. Раймонда—Людміла Бржазоўская, Жан дэ Брыен — Юрый Траян. Абодва яны, нягледзячы на маладосць, заслужаныя артысты рэспублікі. Іх добра ведаюць аматары балета. Адну з вядучых партый—Абдэрахмана — упершыню танцуе Міхаіл Грышчанка. І на наш погляд, робіць гэта паспяхова.

«У «Бахчысарайскім фантане» ў ролі Марыі выступіць 22-гадовая Людміла Сінельнікава. Юная танцоўшчыца ўжо заваявала званне лаўрэата міжнароднага конкурсу. А маладая салістка Ніна Паўлава пакуль што ніякіх тытулаў не мае. Але ёй у «Лебядзіным возеры» даверана галоўная партыя Адэты-Адыліі. Яна вядзе яе арыгінальна, цікава.

Пазнаёмяцца масквічы са Святланай Бастун, Ларысай Міхеда, Уладзімірам Глінскіх, Верай Елсуковай і іншымі маладымі салістамі і зноў сустрэнуцца з артыстамі, знаёмымі ім па гастролях 1972 года, калі ў Маскву выязджаў увесь наш тэатр. Сярод іх народная артыстка БССР Аляўціна Карзянкова, заслужаныя артысты рэспублікі лаўрэат міжнароднага конкурсу Віктар Саркісьян, Ірына Дзідзічэнка, Раіса Красоўская, Яўген Паўловіч, Леанід Чахоўскі.

Акрамя названых спектакляў, мы дадзім у Маскве вечар аднаактовых балетаў. У яго праграме чатыры творы розных эпох і стыляў. Гэта — «Альпійская балада» Яўгена Глебава па матывах аповесці Васіля Быкава, рамантычная сярэдневяковая легенда «Трыстан і Ізольда» Рыхарда Вагнера, а таксама адзін з шэдэўраў Марыуса Пеціпа — гранд-па з балета Людвіга Мінкуса «Пахіта» і «Балеро» Марыса Равеля.

У канцы красавіка мы пакажам на сцэне нашага тэатра спектаклі, якія павязём у Маскву. Будзем рады, калі мінчанам спадабаецца тое, што мы павязём у сталіцу Радзімы.

БЕЛТА.

ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ, РОЗДУМ

АРЫФМЕТЫКА КВЕТАК

«Кветкам уласціва непрыкметная, але пастаянная ўлада над людзьмі. Патрэба ў іх была вялікай ва ўсе часы».

Ул. Салаухін «ТРАВА».

Мужчына з чорнымі вусікамі, у вялікай круглай кепцы, якія любяць насіць на поўдні, прадаваў цюльпаны. Ардынарныя ружовыя цюльпаны. Ён вымаў іх з чамадана па адной кветцы і прасіў за кожную 2 рублі 50 капеек. А мужчына без вусікаў, у зімовай вупанцы, плаціў. Плаціў пічодра, па-рыцарску. Бо было гэта 8-га сакавіка...

Нічога дзіўнага — за адзіны цюльпан. І нават не за свежую кветку, а за сухенькую цыбулінку, давалі некалі 24 чвэрці пшаніцы, 48 чвэрцяў жыта, 4 быкі, 12 авечак, 2 бочкі віна, 4 бочкі піва, 2 бочкі масла, 4 пуды сыру, мноства адзення і срэбраны кубак!.. Пра гэта расказвае ў сваёй кнізе «Трава» Ул. Салаухін. Ён жа прыводзіць апісанне пышных урачыстасцей, якія былі наладжаны на гарадской плошчы аднаго галандскага горада з поваду вывядзення новага сорту цюльпана — чорнага. Было гэта вясной 1673 года.

Прайшло тры стагоддзі, але па-ранейшаму кветкамі сустракаюць нараджэнне дзіцяці, праводзяць чалавека ў апошні шлях, дорань кветкі героям і маці, любімым артыстам і каханым. Кветкамі ўпрыгожваюць абедзенныя сталы і ўрачыстыя залы. Таму не будзем асуджаць таго рыцара, які прынёс сваёй жонцы на свята такі каштоўны цюльпан.

Давайце пакінем на гарадскім рынку і таго — з вусікамі, а самі зробім невялікае падарожжа, зойдзем у магазіны кветак нашай сталіцы. Тым больш, што гэта не зойме шмат часу — у Мінску такіх магазінаў толькі тры.

Два з іх размешчаны на галоўнай магістралі горада, на Ленінскім праспекце, таму і попыт на кветкі ў абодвух магазінах прыкладна аднолькавы. Яны мала чым адрозніваюцца адзін ад аднаго. І ў адным, і ў другім амаль заўсёды пуста і неяк панура. Радамі стаяць гліняныя гаршкі з цыкламенамі і аспарагусам. (Аспарагус, так званая «ёлачка», палюбіўся мінчанам). І яшчэ на прылаўках — туга скручаныя букецікі зеленаватых кветак, якія яшчэ не распусціліся. Цяжка пазнаць у іх пяшчотна-жоўтыя нарцысы, але і яны неўзабаве пойдуць нарасхват. Таму такія спакойныя дзяўчаты-прадаўшчыцы. Спакой, бестурботнасць, відань, прафесійная рыса мінскіх прадаўшчыц кветак. Ды, зрэшты, чаго ім турбавацца? Хай сабе гэтыя кветкі і непрэзентабельныя, усё адно іх раскупяць. Яшчэ як! Сёння пятніца, 23 сакавіка, заўтра субота, а ў выхадныя і перадвыхадныя дні на кветкі асаблівы попыт.

Ну, а як жа быць з букетам для вяселля, з букетам, які хочацца паднесці каханай альбо на дзень нараджэння сябру? Гэтыя нарцысы для такой нагоды не падыходзяць, магчыма, можна заказаць добры букет?

— Ніякіх заказаў не прымаем!— адказвае прадаўшчыца. — Што будзе заўтра ў продажы, тое і возьмеце. Але запэўняю — нічога лепшага не будзе.

Ну, што ж, пойдзем адсюль. У магазін кветак, які размясціўся на вуліцы Карла Лібкнехта.

Тут крыху весялей. Уздоўж сцен— клумбы з жывымі кветкамі, са сцен звісаюць кучаравыя сцябліны раслін-уюноў, аднак на прылаўку... усё тыя ж нарцысы. Праўда, выбар іх тут большы. Ёсць яшчэ ружовыя, бэзавыя, бледна-блакітныя кветкі, якія і формай, і каляровай гамай нагадваюць духмяны гарошак. Але іх не вельмі купляюць — дорага. Пакуль што не купляюць, але ў суботу пойдзе ўсё, а калі раптам «не пойдзе», возьмуць фрэзію і «прывяжуць» яе да нарцыса. Тады абавязкова пойдзе!..

На які густ разлічана фрэзія ў спалучэнні з нарцысам? Вам нават і не адкажуць на такое пытанне. Больш таго, у магазінах вам могуць прапанаваць ружу ў спалучэнні з тым жа нарцысам, гваздзік — з душыстым гарошкам. Быццам работнікам магазіна кветак і чуць не даводзілася пра мастацтва складання букетаў, пра сімволіку кветак, пра тое, што, напрыклад, ружа ў суседстве з іншымі кветкамі адразу вяне. Яны быццам і не ведаюць, што фрэзія наогул не для букетаў. Гэта — аранжарэйная кветка. У аранжарэі яна выглядае вельмі прыгожа. А калі мы ўспомнілі пра аранжарэю, пра аранжарэйную гаспадарку, якая якраз і заклікана забяспечваць магазіны кветкамі, давайце паглядзім, што робіцца там.

Аранжарэі Мінскага камбіната кветак знаходзяцца на тэрыторыі мікраёна, што на Ракаўскай шашы. Дзве шкляныя даўжэзныя галерэі з дзесяткамі «боксаў». Для руж, для гваздзікаў, для калаў, духмянага гарошку і інш. Тут вырошчваюць расаду, тут «пікіруюць» яе, чаранкуюць гваздзік, прывіваюць ружу, лечаць яе.

Многія вырашчаныя тут кветкі адзначаны дыпломамі ВДНГ, а мінскі гваздзік атрымаў нядаўна срэбраны медаль.

Гаспадарка атрымала ў мінулым годзе каля 200 тысяч рублёў прыбытку, тут і высокі працэнт рэнтабельнасці.

Але... кветак на камбінаце мы не ўбачылі. Пятніца, пярэдадзень выхаднога, і таму ўсё, што можна зрэзаць, — зрэзана і адпраўлена ў магазіны. «Усё» — гэта 300 штук руж, 300 — гваздзікаў, 400—калаў... На мільённы горад!

Мала, але і плошча аранжарэй малая — усяго 16,5 тысячы квадратных метраў. У той час, як на такі горад, як Мінск, патрэбна мінімум 100 тысяч квадратных метраў. І гэта не якія-небудзь беспадстаўныя нажаданні. Норма! У дакуменце, які называецца «Будаўнічыя нормы і правілы» (дакумент гэты зацверджаны Дзяржбудам СССР) сказана: «Плошча кветкавых аранжарэй у гарадах (за выключэннем малых) павінна складаць 0,1—0,3 квадратнага метра на аднаго чалавека». Адпаведна — на 1000 жыхароў — мінімум 100 квадратных метраў.

У Мінску, акрамя камбіната, кветкі разводзяць у парнікова-цяплічных гаспадарках. Яшчэ на плошчы 2 тысячы квадратных метраў. У іншых гарадах рэспублікі кветкавы «паёк» яшчэ меншы.

За мінулы год кветкавыя гаспадаркі Мінска прадалі насельніцтву 1.347 тысяч штук кветак. Гэта значыць, кожны жыхар за год змог купіць менш чым па паўтары кветкі. У рэспубліцы ж за мінулы год прададзена 4,8 мільёна штук!

Вы спытаеце, а нарцысы, пра якія ішла гаворка? Нарцысы гэтыя завезены з поўдня і за кожную кветку заплочана 25 капеек. Прадаюць жа іх таксама па 25 капеек! Такая дзяржаўная цана, нічога не зробіш. І камбінату ад такога гандлю застаецца, як у вядомым анекдоце, «навар»...

Аднак, што рабіць, калі насельніцтва горада патрабуе кветак? Калі на іх велізарны попыт? А тут пачынаецца самая сумная «арыфметыка», сумная для камбіната, для дзяржавы. Бо гэты велізарны попыт добра ўлічваюць некаторыя абароцістыя грамадзяне. Яны няблага ўмеюць лічыць. Напрыклад, нейкая А. Чарткова купіла ў горадзе Сухумі 1000 цюльпанаў па 2 капейкі за штуку, а ў Мінску прадала па 20. Спекуляцыяй на кветках займалася і нейкая К. Акімава, якая купляла іх у Баку і Краснадары і прадавала мінчанам. Не адставаў ад яе і М. Гайнулін, ён прывозіў кветкі з горада Чымкента Туркменскай ССР. А грамадзянкі С. Крук і С. Найдзіч нават і не ездзілі нікуды — проста куплялі кветкі на Камароўскім рынку і перапрадавалі іх каля кафэ «Вясна», літаральна насупраць магазіна кветак!.. Чысты прыбытак на кожнай кветцы складаў для гэтых дзялкоў 25 капеек...

Нават некаторыя работнікі дзяржаўнага гандлю «грэюць» рукі на тым, што кветак не хапае. Былі выпадкі, калі кветкі нізкай якасці пускалі ў продаж першым гатункам, «розніца» клалася ва ўласную кішэню. Менавіта за такія злоўжыванні была звольнена з працы і прышпілена да крымінальнай адказнасці былы дырэктар магазіна № 2 «Кветкі».

Пакараны і спекулянты, пра якіх гаварылася вышэй, але прычына, якая вядзе да злоўжываванняў, пакуль што засталася.

Мы пачалі свой расказ з цюльпана, з таго самага, ардынарнага ружовага цюльпана, які прадаваў гандляр з чорнымі вусікамі...

Чаму ж у нас такі дэфіцыт на цюльпаны? Таму што для іх патрэбна месца, патрэбны і цыбуліны, якія павінны вырошчвацца ў спецыяльным каранцінным гадавальніку, каб расліна была здаровай. А такога гадавальніка ў нашай рэспубліцы няма. І даводзіцца купляць насенне і клубні на рынку, а яны, гэтыя клубні і насенне, не правераны каранцінай службай, да таго ж дзяржаўны камбінат не можа купляць іх у прыватным парадку. Таму ў асноўным іх купляюць кветкаводы-аматары.

Кветкаводы-аматары ў многім і пакрываюць дэфіцыт на кветкі. Такіх аматараў — сотні, але пакрываюць яны гэты дэфіцыт вельмі дарагой для мінчан цаной. Некаторыя з іх, уласна кажучы, і не аматары, а звычайныя дзялкі. На сваіх прысядзібных участках яны вырошчваюць тысячы цюльпанаў і прадаюць іх па рублю за кветку.

Але хочацца пагаварыць не пра такіх людзей, пра іх, дарэчы, пісаў нядаўна ў «Правде» Г. Якаўлеў. Ён прапанаваў «унесці карэктывы ў існуючае заканадаўства аб карыстанні прысядзібнымі ўчасткамі, каб пазбавіць дзялкоў магчымасці атрымліваць баснаслоўныя барышы з аранжарэй і цяпліц».

Але пра іх размова асобная. Хочацца сказаць пра тых, хто прадае толькі лішкі, хто вырошчвае кветкі ў імя прыгажосці, у імя любві да жывой прыроды, хто не хоча спекуляваць. Аднак лішкі кветак застаюцца і ў іх.

Чаму б гарвыканкому не стварыць камісійны магазін кветак? Існуюць жа прамтаварныя камісіёнкі. У такім магазіне цэны на кветкі можна кантраляваць. Кветкаводы здавалі б лішкі на камісійны продаж, бо не кожны пойдзе стаяць на базары альбо на вуліцы. Думаецца, што гэта ў нейкай ступені забяспечыла б попыт на кветкі.

Але, бадай, галоўная праблема — будаўніцтва новых аранжарэй. Нельга сказаць, што яно не вядзецца. Але, напрыклад, Мінскі кветкавы камбінат будуецца такімі тэмпамі, што, відаць, і ў 1976 годзе не будзе здадзены. Яшчэ горш вядзецца будаўніцтва кветкавых гаспадарак у абласных цэнтрах. Такія аб'екты, як аранжарэі, у многіх гарадах пакуль што толькі запланаваны.

На будоўлі кветкавых гаспадарак амаль не выкарыстоўваецца замест шкла танная плёнка. У той час як плёначныя зборна-разборныя цяпліцы будаваць значна хутчэй.

Вельмі мала вырошчваецца ў нас летніх і шматгадовых раслін у адкрытым грунце. Існуючыя ж аранжарэі выкарыстоўваюцца не зусім рацыянальна. Замест некаторых «не хадавых» кветак можна было б вырошчваць больш эканамічна-выгадныя.

Наогул у нас часам не разумеюць эканамічнай выгады ад развядзення кветак. Не пашкодзіла б пацікавіцца вопытам нашых суседзяў — кветкаводаў прыбалтыйскіх рэспублік. Скажам, для таго, каб забяспечыць кветкамі Рыгу, створаны саўгасы, якія спецыялізуюцца на вырошчванні кветак. Гэтыя гаспадаркі — рэнтабельныя. А ў рыжан — кветкі круглы год.

Дарэчы, аб усім гэтым добра ведаюць работнікі камунальнай гаспадаркі Мінскага гарвыканкома і Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР.

Ведаюць, але што яны могуць зрабіць? Усёй кветкавай гаспадаркай у Міністэрстве займаецца адзін чалавек — інжынер Г. Кавалёва. Яна вырашае пытанні добраўпарадкавання зон адпачынку і ачысткі гарадоў. Клопатаў больш чым шмат на аднаго чалавека.

Можа таму Кавалёва, цяжка ўздыхнуўшы, заўважыла:

— Не кветкі — галоўнае. З кветкамі можна і пачакаць...

Але чаму тады мінчане плоцяць за кветкі такія грошы? Чаму наогул людзі плоцяць грошы за кветкі? Ул. Салаухін на гэта адказвае так: «У людзей цяпер голад на прыгажосць, голад на сувязі з прыродай...»

Кветкі. Няхай іх хапае на ўсіх. Як сонца.

Р. БАКУНОВІЧ.

У ДНІ ПАСЯЎНОЙ

Калектывы самадзейнасці дома культуры Магілёўскага завода штучнага валакна імя Куйбышава намецілі вялікую праграму культурнага абслугоўвання працаўнікоў сяла і шэфскай дапамогі сельскім самадзейным калектывам.

У Быхаўскім раёне ўжо выступаў заводскі народны ансамбль танца. На сцэне клуба саўгаса «Вараніно» быў паказан спектакль «Шасцёра любімых» па п'есе А. Арбузава. Гэты ж спектакль паглядзелі ў сваім клубе працаўнікі калгаса «Чырвоная зорка» Магілёўскага раёна.

Некалькі канцэртаў для калгаснікаў калгасаў імя М. Горкага і «Шлях Леніна» Горацкага раёна даў агіттэатр «Усмешка».

Гараджане выступілі з канцэртамі ў калгасах «Серп і молат» Чаўскага і «Шлях Ільіча» Круглянскага раёнаў.

Ул. БЕЛЕНЬКІ.

Г. І. ЖЫХАРАЎ

Беларускае музычнае мастацтва панесла вялікую страту. Раптоўна памёр Георгій Іванавіч Жыхараў, загадчык кафедры народных інструментаў, дацэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

Г. І. Жыхараў нарадзіўся ў г. Слаўгарадзе Магілёўскай вобласці ў 1915 годзе. З дзіцячых год палюбіў народную музыку і пранёс гэтую любоў праз усё сваё жыццё. У 1939 годзе Георгій Іванавіч стаў дыпламантам Усесаюзнага агляду выканаўцаў на народных інструментах. Ён быў стваральнікам і кіраўніком цэлага раду ансамбляў і аркестраў народных інструментаў, з'яўляўся пастаянным членам мастацкіх саветаў Рэспубліканскага дома народнай творчасці і Рэспубліканскага дома мастацкай самадзейнасці.

Шмат сіл і энергіі аддаваў Георгій Іванавіч справе навучання і выхавання маладых спецыялістаў. На працягу 24 гадоў работы ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага ім была падрыхтавана вялікая колькасць высокакваліфікаваных музыкантаў.

Усе, хто ведаў Георгія Іванавіча, бачылі ў ім глыбокага прапагандыста народна - інструментальнага мастацтва, актыўнага грамадскага работніка, які аддаваў усе свае сілы росквіту беларускай народнай музыкі.

Светлая памяць аб Георгію Іванавічу Жыхараве назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Група таварышаў.

Міністэрства культуры БССР глыбока смуткуе з прычыны раптоўнай смерці Георгія Іванавіча Жыхарава, дацэнта, загадчыка кафедры народных інструментаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага і выказвае шчырае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.

Дырэкцыя Музея савецка-польскай баявой садружнасці ў сяле Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці даводзіць да ведама ўстаноў, арганізацый і ўсіх грамадзян, што ў сувязі з правядзеннем капітальнага рамонту Музей савецка-польскай баявой садружнасці ў сяле Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці закрыты для наведвальнікаў з 1 красавіка па 10 кастрычніка 1973 года.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І-Ы КУРС НАВУЧАННЯ З АДРЫВАМ І БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ (ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ) У 1973 ГОДЗЕ.

Прыём праводзіцца па спецыяльнасцях: фартэпіяна, скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас, флейта, гобой, кларнет, фагот, валторна, труба, трамбон, туба, ударныя інструменты, цымбалы, баян, акардэон (толькі на дзённае навучанне), домра, балалайка, спевы (толькі на дзённае навучанне), харавое дырыжыраванне, кампазіцыя (толькі на дзённае навучанне) і музыказнаўства.

У кансерваторыю прымаюцца грамадзяне абодвух полаў, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю, праявілі творчы талент, актыўна ўдзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці і атрымалі рэкамендацыі з месца работы ці вучобы, на навучанне з адрывам ад вытворчасці ва ўзросце да 35 гадоў (па спецыяльнасці спевы — да 30 гадоў) і на навучанне без адрыву ад вытворчасці (завочнае навучанне) без абмежавання ўзросту, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены па наступных прадметах: спецыяльнасць; руская мова і літаратура (пісьмова і вусна); гісторыя СССР (вусна).

Экзамен па спецыяльнасці ўключае раздзелы: выкананне праграмы (для выканаўцаў); выкананне ўласных твораў (для кампазітараў); музычная літаратура (для кампазітараў і музыказнаўцаў); пісьмовая работа (для музыказнаўцаў); сальфеджыо (пісьмова і вусна); гармонія (пісьмова і вусна) акрамя вакалістаў; элементарная тэорыя музыкі (пісьмова і вусна) для вакалістаў; фартэпіяна — для дырыжораў хору, кампазітараў і музыказнаўцаў; калёквіум.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара па адзінай форме. Паступаючыя на завочнае навучанне падаюць заяву аб прыёме ў бліжэйшыя да яго месца жыхарства кансерваторыі.

Да заявы прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале), характарыстыка для паступлення ў вну, медыцынская даведка (форма № 286), 4 фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору, памерам 3×4 см.).

Асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш 2-х гадоў і паступаюць на навучанне без адрыву ад вытворчасці, павінны прадставіць заверaную кіраўніком установы выпіску з працоўнай кніжкі.

Пасля прыбыцця ў кансерваторыю, асоба, якая паступае, прад'яўляе асабіста пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпісное пасведчанне (асобы прызыўнога ўзросту).

Заявы прымаюцца з 1 чэрвеня па 5 ліпеня па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Уступныя экзамены для паступаючых на дзённае і завочнае навучанне з 6 па 25 ліпеня.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ НА 1973 ГОД У АСПІРАНТУРУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ МУЗЫКАЗНАЎСТВА (ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ МУЗЫКІ) З АДРЫВАМ І БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ.

У аспірантуру прымаюцца асобы абодвух полаў з адрывам ад вытворчасці не старэй 35 гадоў і без адрыву ад вытворчасці—не старэй 45 гадоў, якія маюць закончаную вышэйшую адукацыю, якія праявілі здольнасці да навукова-даследчай работы і паспяхова здалі конкурсныя экзамены па спецыяльнасці, гісторыі КПСС, замежнай мове ў аб'ёме праграмы для вышэйшых навучальных устаноў.

Экзамен па спецыяльнасці ўключае раздзелы:

а) ГІСТОРЫІ МУЗЫКІ

Рэферат па тэме дысертацыі; гісторыя музыкі (руская, савецкая, народаў СССР і зарубежная); тэорыя музыкі: гармонія (пісьмова), поліфанія і аркестроўка (вусна), аналіз музычнага твора буйнай формы; калёквіум.

б) ТЭОРЫЯ МУЗЫКІ

Рэферат па тэме дысертацыі; тэорыя музыкі; гармонія (пісьмова), аркестроўка (пісьмова), поліфанія (пісьмова), аналіз музычнага твора буйнай формы; гісторыя музыкі (руская, савецкая, народаў СССР і зарубежная); калёквіум.

Заява аб прыёме ў аспірантуру падаецца на імя рэктара з указаннем выбранай спецыяльнасці і формы навучання (дзённае, завочнае) з прыкладаннем:

а) асабістага лістка па ўліку кадраў з фотакарткай;

б) характарыстыкі з апошняга месца работы;

в) выпіскі з пратакола пасяджэння савета вну для асоб, якія рэкамендаваны для паступлення ў аспірантуру непасрэдна пасля заканчэння кансерваторыі.

Пашпарт і дыплом аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы прад'яўляецца асабіста паступаючым у аспірантуру.

Заявы прымаюцца з 25 мая да 25 чэрвеня па адрасу:

220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Уступныя экзамены для паступаючых на навучанне з адрывам і без адрыву ад вытворчасці з 26 чэрвеня.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ НА 1973 ГОД У АСПІРАНТУРУ-СТАЖЫРОЎКУ З АДРЫВАМ І БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ: ФАРТЭПІЯНА, СТРУННЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ (скрыпка, віяланчэль), НАРОДНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ (цымбалы, баян), ХАРАВОЕ ДЫРЫЖЫРАВАННЕ; З АДРЫВАМ АД ВЫТВОРЧАСЦІ — КАМПАЗІЦЫЯ.

У аспірантуру-стажыроўку прымаюцца асобы абодвух полаў не старэй 35 гадоў з адрывам ад вытворчасці і не старэй 45 гадоў без адрыву ад вытворчасці, што маюць закончаную вышэйшую адукацыю, паспяхова здалі конкурсныя экзамены па спецыяльнасці, гісторыі КПСС, замежнай мове ў аб'ёме праграмы для вышэйшых навучальных устаноў.

Экзамен па спецыяльнасці (для выканаўцаў) уключае раздзелы: выкананне сольнай праграмы; рэферат па методыцы выкладання спецыяльнасці; калёквіум па пытаннях методыкі, педагогікі і выкананню.

Экзамен па спецыяльнасці кампазіцыя ўключае раздзелы: прадстаўленне сачыненняў; гармонія (пісьмова); поліфанія (пісьмова, абавязкова напісанне фугі); аркестроўка (вусна і пісьмова); аналіз музычнага твора буйнай формы; калёквіум.

Заява ў аспірантуру - стажыроўку падаецца на імя рэктара з указаннем абранай паступаючым спецыяльнасці і формы навучання (дзённае, завочнае) з прыкладаннем:

а) асабістага лістка па ўліку кадраў з фотакарткай;

б) характарыстыкі з апошняга месца работы або навучальнай установы, якая рэкамендуе ў аспірантуру-стажыроўку;

в) выпіскі з пратакола савета вну (для асоб, рэкамендаваных да паступлення ў аспірантуру - стажыроўку пасля заканчэння кансерваторыі).

Пашпарт і дыплом аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы прад'яўляюцца асабіста паступаючым у аспірантуру - стажыроўку.

Заявы прымаюцца з 25 мая да 25 чэрвеня па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Уступныя экзамены для паступаючых на навучанне з адрывам і без адрыву ад вытворчасці з 26 чэрвеня.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ НА ДВУХГАДАВОЕ ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ СПЕВАЎ У 1973 ГОДЗЕ.

Прымаюцца асобы абодвух полаў, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю ва ўзросце да 23 год, што валодаюць вакальнымі і сцэнічнымі дадзенымі.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара з прыкладаннем дакументаў:

характарыстыкі з апошняга месца работы або вучобы; дакумента аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале); 4-х фотакартак (здымкі без галаўнога ўбору 3×4 см); медыцынскай даведкі па форме № 286.

Пасля прыбыцця паступаючы прад'яўляе асабіста пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпісное пасведчанне (асобы прызыўнога ўзросту).

Заявы прымаюцца з 10 мая па 20 чэрвеня па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Праслухоўванне з 21 па 25 чэрвеня.

НІ ДАЦЬ — НІ УЗЯЦЬ

ФЕНАМЕНАЛЬНЫ КАРКУХІН

РЭЙС самалёта Мінск—Масква на гадзіну адкладваўся з-за нізкай воблачнасці. Забеспячэнец Каркухін падаўся ў буфет піць піва, а я прысеў на канапу ў зале чакання, назіраючы за мітуснёю пасажыраў.

— На Маскву? — звярнуўся да мяне мужчына ў пыжыкавай шапцы.

— Так, — адказаў я.— А вы, відаць, у нас у камандзіроўцы?

— Ды вось, чатыры дні пражыў тут, а ўсё ж выбіў што трэба!.. — задаволена ўсміхнуўся мой субяседнік і назваў міністэрства, да якога адносіўся і наш камбінат.

Незнаёмец разгарнуў газету, крыху пачытаў, а затым, хмыкнуўшы, чыркнуў пазногцем па адной з нататак і падаў газету мне.

— Бываюць жа людзі! — пакруціў ён галавою.

Я хутка прабег вачыма кароценькае паведамленне, дзе гаварылася пра фенаменальную памяць аспіранта-філолага. Аспірант, па словах аўтара, памятаў увесь арфаграфічны слоўнік і мог беспамылкова назваць нават старонку, на якой надрукавана тое ці іншае слова.

— А Каркухіна вы ведаеце? — запытаў я ў незнаёмца, ніколькі не ўсхваляваны нататкай.

— Не. Здаецца, не ведаю... А хто ён?

— О, гэта і ёсць сапраўдны феномен, хаця і не аспірант! Гэта што!..— пстрыкнуў я пальцам па нататцы. — Каркухін ведае ўсіх і ўсё ў нашай сістэме ва ўсесаюзным маштабе, і вас ён, бясспрэчна, ведае, калі вы з нашай сістэмы!

— Адкуль? — субяседнік нават адсунуўся ад мяне і памацаў рукою сакваяж.

— Гэта сакрэт Каркухіна. Калі жадаеце, можам зараз праверыць. Толькі, калі ласка, назавіце сваё імя і імя па бацьку ды яшчэ горад, дзе вы працуеце.

— Сцяпан Фёдаравіч з Краснаярска, — прашаптаў мужчына і адсунуўся яшчэ далей.

Тым часам да нас, задаволена пабліскваючы чорнымі вочкамі, падляцеў Каркухін.

— Ну, і піва, я вам скажу! Мара! — круглы твар забеспячэнца ззяў, бы новы мядзяк.

— Знаёмцеся, — прапанаваў я Каркухіну. — Гэты таварыш з нашай сістэмы — Сцяпан Фёдаравіч з Краснаярска...

Каркухін неяк увесь падабраўся, прыплюшчыў вочы і зашаптаў:

— Блокі ў Ташкент—Карымаву... Карымаў — вузлы ў Архангельск Ларыну... Ларын — неліквіды ў Баку Рахім-задэ... Рахім-задэ — катлы ў Краснаярск...

Незнаёмец ужо было падняўся, каб шмыгнуць куды-небудзь падалей ад нас, але Каркухін схапіў яго за руку.

— Рады пазнаёміцца! Вы — Чыркоў Сцяпан Фёдаравіч! Як здароўе жоначкі Вашай Антаніны Андрэеўны? Як Ігарок і Наташа вучацца? Дарэчы, Іван Раманавіч не нахваліцца пыжыкавай шапкай, якую вы яму ў мінулым месяцы прыслалі...

ПА СВЕТУ ДОБРА ПАХАДЗІЎШЫ...

ТАЛЕНТЫ І ПАКЛОННІКІ

Бяздарны акцёр дзяліўся са сваім сябрам:

— Ты ўяўляеш, як я люблю свой тэатр! Нават калі я не іграю, а проста гляджу на сцэну, мяне праймаюць дрыжыкі...

— Ведаеш, і мяне таксама.

— Чаму? — здзівіўся акцёр.

— Ад жаху...

— Чаго ж ты баішся?

— Твайго нечаканага з'яўлення на сцэне.

□

Два тэатралы размаўляюць пра славутага спевака.

— Як ён цудоўна спявае! — кажа адзін.

— Гм... калі б у мяне быў голас, я таксама гэтак спяваў бы.

□

— Ура! Нарэшце я атрымаў вядучую ролю ў п'есе!

— Ты іграеш галоўнага героя?

— Не, але я вяду каня, на якім ён едзе!

□

Сустрэліся двое знаёмых. Размаўляюць. Першы і кажа:

— Еду я пазаўчора адзінаццатым нумарам трамвая па Зялёнай вуліцы і раптам бачу: насупраць мяне сядзіць — хто б ты думаў — Паганіні!

Другі памаўчаў, падумаў і кажа:

— Ведаеш што... не хлусі. Адзінаццаты нумар па Зялёнай вуліцы не ходзіць.

□

На канцэрце.

— Ты пазнаеш Бетховена?

— Пачакай, няхай ён павернецца, я тады табе скажу.

□

— Гэты тэнар спявае таксама і барытонам...

— Няўжо? Значыць, ён адзін можа заспяваць дуэтам?

ГУМАР, САТЫРА

Пятро КРАСЮК

ПАГОЛЕНЫ ВОЖЫК

БАЙКА

Лісіца Вожыку сказала:
— Прыгажуноў я ведаю не мала,
І сярод іх ты мог бы першым быць,
Пасватайся хоць да маёй унучкі.
А каб цябе і лашчыць, і любіць,
Ты мусіш пагаліць свае калючкі.
Яны псуюць усё тваё аблічча,
Ніхто такога ў госці не пакліча.
З цябе ж смяюцца нават дурні! —
І ўгаварыла.
Вожык — у цырульні.
Зірнуў у люстра, выйшаў на дарогу.
Лісіца — хап і схрумстала сырога.

Пераклаў з украінскай С. ГРАХОЎСКІ.

Васіль КАРПЕЧАНКА

ВЫСОКАЯ ДРУЖБА

Хваліўся гардэробны Крук
Навокала ўсім чыста,
Што ён — найлепшы друг
Капелюшу міністра.

Уладзімір РУДЗІНСКІ

ПАРАІЎ

Неяк Чыжык Салаўю параіў:
«Не мудрагель—
спявай,
як я спяваю»...

А ТЫ АДКУЛЕЧКА, ПРЫЯЦЕЛЬ?

У пакой зазірала зыркае сонейка. Пад акном цёплы ветрык-гарэза хістаў кучаравыя бярозкі. Яўсей Кірылавіч заёрзаў у крэсле і не вытрымаў, шмарганў штору. Зноў сеў за стол, закурыў. Разгладзіў аркуш, скокваючы, набегла па беламу аркушу...

«Паважаны таварыш рэдактар! Мяне зняважылі, я абураюся. Не, мала таго, — гневаюся, — пісаў Яўсей Кірылавіч. — Але спачатку — аб сабе, каб ведалі, з кім маеце справу. Я — клубны работнік, як кажуць, сейбіт культуры.

Цяпер па сутнасці. Да скаргаў працоўных, як я разумею, трэба ўважліва адносіцца. А што ў некаторых бюракратаў атрымліваецца? Сёння пазваніў да вас у рэдакцыю і кажу: патрабую, каб у дом адпачынку неадкладна прыехаў карэспандэнт. Суб'ект, які адгукнуўся, назваў сябе літаратурным работнікам. Ганарыста так чамусьці падазрона паглядзеў на самапіску: не падвядзе?

— От я табе, бюракрат нящчасны, задам зараз, — прабурчэў сабе пад нос. — Я цябе навучу, як на свеце жыць!

Пяро торкнулася ў паперу і, жвава падрэкамендаваўся і пытае: «Што яму там рабіць, карэспандэнту?» Як што? Фельетон напісаць, кажу. Куды ні зірні — беспарадкі. На дарожках, у альтанках брудна, смецце, акуркі валяюцца... А я, можа, у гэтай альтанцы культурна адпачываю? От і дабівайся тут абхазскага даўгалецця...

Ведаю: параіце звярнуцца да дырэктара дома адпачынку. Скардзіўся! Як гарохам аб сцяну... Яму абы дзень да вечара. Прычачэніцца і пахаджвае сабе па двары ды свой «футбол» пад кашуляй пагладжвае. Адгадаваў, бюракрат таўстаскуры. Харчуецца без адрыву ад вытворчасці, спажывае на грамадскай кухні, што душа прымае...

Пра ўсё гэта я, таварыш рэдактар, расказаў таму вашаму літаратурнаму работніку. Хлусіць не буду, выслухаў ён мяне да канца. А потым — як аглушыў: «Карэспандэнта высылаць немэтазгодна».

Ну, вы толькі падумайце, таварыш рэдактар! Адкуль яно, такое нахабства, таварыш рэдактар? Многа ёсць у нас яшчэ розных... бескультурных. Усім, вядома, свой розум не ўкладзеш, але ўкладваць трэба. Мы ж — сейбіты культуры. Так што — карэспандэнта высылайце, будзем разам наводзіць парадак. А не — вышэй сігналізую. Я чалавек з пазіцыяй, за сваё пастаяць магу».

Яўсей Кірылавіч пашкроб канцом самапіскі калматае брыво, падумаў і нетаропка закончыў допіс: «Толькі няхай прыязджае паміж пятнаццаццю і шаснаццаццю гадзінамі. Мае суседзі ў гэты час спяць, і я вольны ад культурнага заняткy».

Устаў, задаволена пазяхнуў. Ды раптам ён спахапіўся, зірнуў на гадзіннік. Грукнуў кулаком у тонкую перагародку да суседзяў:

— Гэй вы, бегемоты! Хопіць дрыхнуць. Карты заплесняюць! У альтанку!

І энергічна тыцнуў цыгарэтай у падаконнік.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 05709

Адрас рэдакцыі: 220600 ГСП Мінск вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.